

ХАЙ БУДЗЕ БОЛЬШ БЕЛАРУСАЎ 4

ЯКІМІ ЯКАСЦЯМІ ПАВІНЕН ВАЛОДАЦЬ ДЭПУТАТ? МС



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 ЛІСТАПАДА 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 217 (29084)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КУХАРАЎ, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«На базе Магілёўскай і Гродзенскай абласцей будзе рэалізаваны пілотны праект па цеплавой мадэрнізацыі жылля. Цяпер у рэгіёнах ідзе адпрацоўка з жыхарамі пераліку жылых дамоў (гэта прыкладна 250 дамоў), дзе будзе цеплавая рэабілітацыя. Думаю, што ў найбліжэйшы час пасля падпісання неабходных дакументаў пачнецца рэалізацыя гэтага праекта. Акрамя таго, з экспертамі зараз адпрацоўваюцца мерапрыемствы па павышэнні энергаэфектыўнасці сацыяльных аб'ектаў. У самы бліжэйшы час ва ўрадзе пройдзе нарада па канкрэтызацыі гэтых мерапрыемстваў».*

# РОБАТАТЭХНІКІ І САЙТАСТВАРАЛЬНІКІ



**Учора Парк высокіх тэхналогій адкрыў STEM-цэнтр у сярэдняй школе № 1 у Драгічыне. Дзякуючы сучаснаму абсталяванню і модульнай мэблі вучні атрымалі магчымасць індывідуальна і ў камандзе вывучаць робататэхніку, праграмаванне, сайтабудаванне, 3D-мадэляванне. Напрыклад, Арцём РАКОВІЧ *(на фота)* адразу захапіўся наладкай робата.**

Фота БелТА.

## КОРАТКА

• **У Кітаі выпрабавалі апарат для пасадкі на паверхню Марса.**

• Урачыстае адкрыццё бізнес-інкубатара StartUP прайшло ўчора ў Горках.



• **У Беларусі на 1 студзеня на дыспансерным уліку знаходзілася 335 898 пацыентаў з цукровым дыябетам.**

• 15—17 лістапада ў Гродне пройдуць чэмпіянат свету па гіравым трыятлоне і Кубак свету па гіравым спорце.

• **Кібермахляр падманууў жыхарку Маладзечна, выкраўшы з яе картрахунку 20 тысяч долараў і 13,5 тысячы еўра.**

ISSN 1990 - 763X

На скрыжаванні думак

## УСЕ ВЕДАЮЦЬ, ЯК «НЕЛЬГА». А ЯК ТРЭБА?

### У беларускай інтэрнэт-прасторы з'явіўся сайт adukavanka.by

**«Адукаванка» — некамерцыйная грамадзянская ініцыятыва. Яе асноўная мэта — стварыць пляцоўку, дзе будуць сыходзіцца праблемы адукацыі, іх рашэнні і людзі, якія гатовы над імі працаваць. Кожны можа далучыцца і абмеркаваць тое, што баліць.** СТАР. 3



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Рэагаванне

## «Мы адчулі, што нам гатовы дапамагчы»

### Міністэрства аховы здароўя адказала на публікацыю «Звязды»

**Гісторыю 18-гадовага Дзмітрыя Жызнеўскага, хворага на фенілкетанурыю, «Звязда» расказвала месяц таму ў артыкуле «Дыета на ўсё жыццё». Мы абяцалі сачыць за сітуацыяй. Нагадаем, што з-за гэтага цяжкага генетычнага захворвання мінчанін можа ўжываць толькі 20 % са звыклых нам прадуктаў. «Вада, цукар і алей — тры рэчы, якія яму можна без абмежавання», — такую рэкамендацыю атрымала мама Дзмітрыя яшчэ пры выпісцы з радзільнага дома. Большая частка рацыёну маладога чалавека складаецца са спецыялізаванага лячэбнага харчавання — амінакіслотных сумесяў. Смак некаторых штодзённых для нас прадуктаў, напрыклад мясных, ён увогуле не ведае. Бо жорсткая дыета ў Дзмітрыя з нараджэння. Але інваліднасць, а разам з ёй і магчымасць бясплатна атрымліваць неабходнае лячэбнае харчаванне, малады чалавек меў толькі да 18 гадоў. Пасля пажыццёвае захворванне засталося, а ўсё астатняе — не.**

Калі набываць спецыяльныя амінакіслотныя сумесі самастойна (адна бляшанка каштуе 150—160 рублёў), то у месяц гэта абыдзецца ў 1200 рублёў. Дзмітрый пакуль не працуе, ён студэнт лінгвістычнага каледжа, і выдаткоўваць такія грошы яго сям'і вельмі няпроста. У іншых краінах, у тым ліку суседніх, сітуацыя працейшая: пры паказаннях хворыя на фенілкетанурыю атрымліваць бясплатныя сумесі не толькі ў дзяцінстве, а на працягу ўсяго жыцця. СТАР. 4

# МЯЖА ПАРАЗУМЕННЯ

## Узаемадзеянне з Расійскай Федэрацыяй павінна быць празрыстым

**Прэзідэнт Беларусі заявіў пра гэта перад тым, як заслухаў даклад старшыні Дзяржпагранкамітэта Анатоля Лапо і дзяржсакратара Савета бяспекі Станіслава Зася аб узаемадзеянні Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі ў сферы пагранічнай бяспекі.**

Нагодай для сустрэчы стала чарговае завяршэнне тэрміну дзеяння Дагавора паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб узаемных намаганнях у ахове мяжы. Месяц таму кіраўнік дзяржавы даручаў грунтоўна прапрацаваць гэту тэму з расійскімі партнёрамі.

«Мы свае абавязкі, згодна з гэтым дагаворам, выконваем цалкам, на сто працэнтаў, у плане барацьбы з асноўнымі злачынствамі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта і наркотыкі, боепрыпасы, скрадзены аўтатранспарт. Мы таксама актыўна змагаемся з нелегальнай міграцыяй і заўсёды прыводзілі прыклад, што пагранічнае ведамства Беларусі ну проста ў разы больш эфектыўна працуе на сумесных межах».

Прэзідэнт падкрэсліў: мы надзейна абараняем інтарэсы на першых метрах «нашай агульнай Айчыны, як свае, так і нашага галоўнага саюзніка — Расійскай Федэрацыі».

«Быццам бы праблем няма, у той жа час, па інфармацыі іншых ведамстваў, яны ёсць, — заўважыў Прэзідэнт. — Напрыклад, колькі мы вядзём перагаворы з Расіяй з нагоды перасячэння нашай унутранай мяжы — пад Смаленскам, скажам, Бранскам, Псковам — грамадзянамі трэціх краін... Калі замежны грамадзянін (аўстрыец, немец, паляк) прыехаў (у Беларусь. — **«Зв.»**) праз мяжу пад Брэстам, то яго нават з расійскай візай могуць пад Смаленскам не прапусціць (у Расію. — **«Зв.»**). Яго вяртаюць назад: давай едзь праз літоўска-, латвійска-расійскую мяжу, альбо (дзіўна!) украінска-расійскую. Гэта што такое?!»

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што расіяне прызнаюць — мы ахоўваем знешнія межы Саюзнай дзяржавы лепш, чым яны самі. Але нягледзячы на тое што грамадзянін трэцяй краіны трапляе на агульную прастору Беларусі і Расіі, пасля праверкі беларускімі памежнікамі і іх дазволу расіяне разварочваюць чалавека і прымушаюць перасякаць сваю мяжу праз іншыя дзяржавы. Прэзідэнт назваў такую сітуацыю абсурднай і заклікаў вырашыць гэта пытанне з расіянамі.

«Яшчэ адна праблема — гэта чэргі, якія, па вашай інфармацыі, дасягаюць 10 кіламетраў пад Смаленскам, — абазначыў кіраўнік дзяржавы. — Грузавікі, якія едуць праз Беларусь у Расію, выстройваюцца для нагляду, і не толькі пагранічнага: і мытнага, і фітасанітарнага, і іншых. Як так? Агульная мяжа. Дамовіліся. Пад Брэстам гэтую машыну вывернулі навыварат. Ведаем, куды ідзе, што вязе, перадалі Расійскай Федэрацыі інфармацыю. Яны спыняюць гэтыя машыны пад Смаленскам, Бранскам зноў і нанова іх выварочваюць. Гэта ненармальна».

Калі ігнаруецца наш кантроль, мы выцерпім, заўважыў Прэзідэнт, але навошта тады ад нас нешта патрабаваць? «Гэта не тое, што недавер. Гэта абсурд. Проста абсурд, — паўтарыў Аляксандр Лукашэнка. — Эфекту ж ніякага ад гэтага няма. Навошта? Такога быць не павінна».

Прэзідэнт заўважыў: у беларускіх пагранічнікаў з Расіяй усё добра, у ваенных дзвюх краін праблем няма, тое ж у транспартных ведамствах, але калі ўсе пытанні зводзяцца на ўзроўні ўрадаў, з'яўляецца маса праблем, і як вынік — папрокі ў адрас Беларусі ва ўтрыманстве за кошт Расіі.

«Трэба палічыць, чаго нам каштуе абарона сумеснай мяжы, нагадаць ім пра сістэму супрацьпаветранай абароны, аб якой яны доўга прасілі мяне і якую зрабілі сумеснай — ад Балтыкі да Чорнага мора мы сёння працуем на Расійскую Федэрацыю, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта таксама грошай каштуе. І не толькі грошай. Сёння грашыма ўсе не вымераць. Але мы ўсё роўна «нахлебнікі».

Зараз ідзе працэс перагавораў па далейшай інтэграцыі ў рамках Саюзнай дзяржавы, таму важна, каб расіяне ведалі пра ўнёсак беларусаў у абарону іх інтарэсаў. «Спадары старэйшыя браты расіяне, паглядзіце, якія паслугі мы вам аказваем! І гэта не танна, — заўважыў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Вось зараз закупілі ў Расіі сучасныя самалёты, але ж мы выконваем функцыю абароны і на гэтым напрамку Расійскай Федэрацыі, народа Расіі. Дык чаму нам не дапамагчы? Чаму не паставіць зброю сучасную? Мы ўмеем ёй карыстацца не горш за расіян, але плацім за гэта каласальныя грошы».

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што Беларусь і далей будзе дасканала выконваць свае міжнародныя і саюзніцкія абавязацельствы, але людзі павінны ведаць, што падстаў для абвінавачвання нашай краіны ў тым, што яна абцяжарвае Расію, няма.

«Трэба ўсе гэтыя пытанні на ўзроўні ўрада зводзіць і на стол: вось мы дапамагаем, і каб расійскае грамадства ведала і разумела, што беларусы ніякія не нахлебнікі, што расіяніну тут у Беларусі не горш, чым у Расіі, — загадаў лідар краіны. — Давайце прама казаць: лепш, чым у Расіі. І гэта каштуе грошай».

Таму, калі расійскае кіраўніцтва гатова ў гэтым кірунку дзейнічаць, Беларусь са свайго боку гатова заключыць новы дагавор аб абароне агульных межаў, заявіў Прэзідэнт. «Калі расіяне не жадаюць гэтага, ну што ж, тады нам трэба быць гатовымі, як мы працуем зараз, дзейнічаць, абараняючы свае інтарэсы ад імя Рэспублікі Беларусь, у адзіночку», — дадаў ён.

Усе згаданыя пытанні павінны быць празрыстыя і абмяркоўвацца на перагаворах з кіраўніцтвам Расійскай Федэрацыі, у гэтым выпадку — з пагранічным ведамствам, даручыў Аляксандр Лукашэнка.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

### У тэму

Пяцігадовы тэрмін дзеяння дагавора паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб сумесных намаганнях у ахове Дзяржаўнай граніцы Беларусі хутка заканчваецца. Тут магчымы тры шляхі дзеяння — ён можа спыніцца, актуалізавацца або па змаўчанні працягвацца. Адказныя за дакумент ведамствы краіны правялі аналіз пагаднення. Як адзначыў **дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Станіслаў ЗАСЬ,** шэраг яго палажэнняў ужо страціў сваю актуальнасць.

Па словах Станіслава Зася, многія пункты дагавора прыносяць карысць, але шматлікія выконваюцца фармальна ці не ў поўнай ступені. Напрыклад, намаганні па развіцці інфраструктуры, аснашчэнні сіл і сродкаў для аховы граніцы. Значных праблем на беларуска-расійскай мяжы няма, але ёсць рэчы, якія неабходна выпраўляць у тым ліку і ў дагаворы. «Мы як краіна транзітная страчваем сваю прывабнасць, таму што там (на мяжы. — **«Зв.»**) выбудоўваюцца нейкія пункты кантролю і «заварочваюцца» і грамадзяне, і грузы, ці праходзяць праз іншыя краіны. Гэта мінус нам як транзітнай краіне», — паведаміў дзяржсакратар Савета бяспекі.

На яго думку, адкрытасць сумеснай граніцы прыносіць нашай краіне не толькі карысць, але і праблемы, якія ўключаюць незаконную міграцыю, наркатрафік. «Уся незаконная міграцыя, якая ў нас фіксуецца практычна кожны дзень, — гэта людзі, якія ідуць з таго боку, карыстаючыся празрыстасцю мяжы. І мы іх затрымліваем на сваёй граніцы і пачынаем з імі разбірацца, — адзначыў Станіслаў Зась. — Другое, тая кантрабанда наркотыкаў таксама ідзе ў асноўным з таго боку (Цэнтральнай Азіі, Афганістана) праз гэтую адкрытую граніцу».

Па словах Станіслава Зася, Беларусь разумее намаганні Расіі па забеспячэнні сваёй бяспекі і папярэджанні тэрарыстычнай пагрозы, але прапануе шукаць іншыя шляхі для сумесных дзеянняў.

Шмат гадоў існавала такая сістэма. Напрыклад, у Брэст на пункт пропуска прыязджалі грамадзяне, іх правяралі нашы пагранічнікі. Калі імён не было ў агульных спісах неўязных і мелася расійская віза, яны маглі свабодна працягваць падарожжа.

«Зараз чамусьці ўся гэта справа змянілася. У чым тут сэнс? Мы не бачым карысці ў новых кроках, а нязручнасць для тых, хто падарожнічае, ёсць», — канстатаваў Станіслаў Зась.

Ён звярнуў увагу, што расійскія калегі тлумачаць новыя дзеянні на граніцы тым, што так патрабуе закон. А на пытанне, чаму раней было па-іншаму, выразнага адказу ад іх так і не пачулі.

**Старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі Анатоль ЛАПО** расказаў, як функцыянуе сістэма аховы граніц Саюзнай дзяржавы. Беларускія пагранічнікі кантралююць бяспеку межаў на беларускім участку, а расійскія — на сваім. «І размова не ішла, каб нам хтосьці дапамагаў. Мы самі ў стане забяспечыць сваю бяспеку і бяспеку Саюзнай дзяржавы, — сказаў Анатоль Лапо. — Мы ставім пытанне, чаму на нашай унутранай мяжы існуюць пагранічнікі».

На яго думку, праўкі ў дагаворы павінны расставіць кропкі над «і» ды прызнаць раўнапраўнасць пагранічных ведамстваў краін.

«Мы свае саюзніцкія абавязацельствы заўсёды выконвалі і будзем выконваць. І прэтэнзій да нас ніколі не было», — адзначыў старшыня Дзяржпагранкамітэта.

Толькі сёлета беларускія пагранічнікі затрымалі 504 кілаграмы наркотыкаў, якія ішлі ў Расію.

«Якія мы нахлебнікі? Мы забяспечваем і іх бяспеку. Калі ўзяць мінулы год, колькі мы наркотыкаў затрымалі, якія ішлі ў Санкт-Пецярбург. У нас ёсць свае ВНУ, мы вучым сваіх хлопцаў, дзесьці ў іх (расіян. — **«Зв.»**) бяром вопыт», — падкрэсліў Анатоль Лапо і дадаў, што перамоўны працэс з расійскімі калегамі па актуалізацыі дагавора пачнецца ў хуткім часе.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Ізраіль і Газа дамовіліся аб спыненні агню

Пасля двух дзён артылерыйскіх абстрэлаў з абодвух бакоў увайшло ў сілу пагадненне аб спыненні агню паміж Ізраілем і сектарам Газа. Гэта было самае жорсткае сутыкненне за апошнія некалькі месяцаў.



Паводле інфармацыі ўрачоў з абодвух бакоў, раненні атрымалі дзясяткі палесцінцаў і ізраільцян. Эскалацыя канфлікту пачалася пасля таго, як ізраільскія ваенныя забілі аднаго з лідараў «Ісламскага джыхаду» Баху Абу аль-Ату. Высокапастаўлены егіпецкі чыноўнік паведаміў агенцтву France-Presse, што пагадненне аб спыненні агню было заключана «ў выніку намаганняў Егіпта». Напярэдадні прэм'ер-міністр Біньямін Нетаньяху заўважыў, што Ізраіль не хоча абвастраць сітуацыю, але гатовы да зацяжнога канфлікту. Палесцінскія арганізацыі ў Газе тады ж выпусцілі сумесную заяву, у якой паабяцалі, што Ізраіль сутыкнецца з наступствамі.

### У каледжы Благавешчанска студэнт расстраляў аднагрупнікаў

У выніку адзін чалавек загінуў, сам страляк здзейсніў самазабойства. Па звестках партала «Амур.инфо», стральбу зладзіў навучэнец чацвёртага курса, які прыйшоў у каледж са зброяй. Паводле папярэдняй інфармацыі, студэнта выдалілі з заняткаў, пасля чаго ён вярнуўся з паляўнічай стрэльбай Іж-81 і расстраляў аднагрупнікаў. Па папярэдніх звестках, тры чалавекі атрымалі раненні. Як паведамляюць СМІ, зброя была афіцыйна зарэгістравана на нападніка.

### Першы еўрапейскі завод Tesla пабудуюць каля Берліна

Амерыканскі мільярдэр і вынаходнік Ілан Маск вызначыўся з месцам для будаўніцтва свайго першага аўтазборачнага завода ў Еўропе — ім стане Берлін. «Нямецкая інжынерная думка — выбітная. Берлін круты. Адны з найлепшых аўтамабіляў зроблены ў Германіі», — сказаў прадпрымальнік, атрымліваючы ў Германіі прэмію Golden Steering Wheel. Новы завод пабудуюць недалёка ад новага аэрапорта Берліна, акрамя таго, з'явіцца і інжынерна-канструктарскі цэнтр.




Пачынаючы з 2021-га, як чакаецца, тут будуць вырабляцца Tesla Model 3 і новы кампактны пазадарожнік Model Y. Цікавасць да вытворчасці ў Германіі звязана з роставом попыту на электрамабілі ў Еўропе. Аналіз галіны паказаў, што ў недалёкай перспектыве буйнейшыя заводы па вытворчасці такіх аўто будуць размешчаны ў Германіі, Францыі, Іспаніі і Італіі. Каля 16 буйных прадпрыемстваў па вытворчасці літый-іённых акумулятарных батарэй павінны пачаць работу ў Еўропе да 2023 года. Планы Маска могуць падштурхнуць развіццё нямецкай прамысловасці/ Амерыканскі вынаходнік і бізнесмен дзякуючы заводу ў Берліне атрымае магчымасць прадаваць электрамабілі з паметкай «зроблена ў Германіі».

### Блізкая ўлада

## НА ПРАМОЙ СУВЯЗІ

У суботу, 16 лістапада, з 9.00 да 12.00 кіраўнікі абласной вертыкалі праводзяць традыцыйныя прамыя лініі. У гэты час на сувязі будуць:

намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. (8 0162) 21 31 21;

старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. (8 0212) 22 22 22;

намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. (8 0232) 33 12 37;

старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Васілевіч КРАЎЦОЎ. Тэл. (8 0152) 73 56 44;

намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. (8 0222) 50 18 69;

намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ. Тэл. (8 017) 500 41 60;

старшыня Мінскага гарвыканкама Анатоль Аляксандравіч СІВАК. Тэл. (8 017) 222 44 44.

# УСЕ ВЕДАЮЦЬ, ЯК «НЕЛЬГА». А ЯК ТРЭБА?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Нават калі ў аднаго чалавека ёсць праблема, якая звязана з сістэмай адукацыі, значыць, праблема ёсць. У прасторы «Адукаванкі» мы не падзяляем праблемы на вялікія і маленькія, на значныя і нязначныя. Калі хоць бы аднаму чалавеку нешта здаецца праблемай, гэта ўжо падстава для абмеркавання і пошуку рашэнняў, — падкрэсліваюць стваральнікі сайта. — Няма нейкай «больш значнай» за іншыя мэтавай групы. То-бок настаўнікі, бацькі, вучні, прадстаўнікі органаў кіравання, прадстаўнікі грамадства і іншыя маюць права на тое, каб іх пачулі. Усе маюць права на роўны дыялог. Мы публікуем праблемы і рашэнні, нават калі яны канфліктуюць паміж сабой, бо гэта спосаб адшукаць патэнцыйныя канфліктныя пункты і ўвогуле знайсці рашэнне. Атмасфера павагі і даверу — гэта першае, што трэба стварыць для прадуктыўнага абмеркавання».

«Мы часта гаворым пра тое, што нам не падабаецца, якія памылкі робіцца «наверсе». А ці ёсць у нас пазіцыя, як павінна быць? Такая, якую хочацца выпрацоўваць, пра якую і паспрачацца цікава? Мы паміж сабой амаль ніколі і не гаварылі, а якая ў нас павінна быць парадыгма? Кожны з нас часцей за ўсё «супраць» нечага, а не «за» штосьці, — разважае **кандыдат педагагічных навук, адна са стваральніц сайта Кацярына КУКСО.** — Напрыклад, хацелі ацэньваць школы па выніках ЦТ — выйшла дрэнна, але альтэрнатыву не прыдумалі. Давайце пазбаўляцца ад ілюзій наконт таго, што ў нас усе школы аднолькавыя і што іх можна ацаніць адным інструментам. Не трэба вымяраць адной лінейкай усе навучальныя ўстановы ў краіне... У Беларусі амаль не праводзілася даследаванняў, якія датычыліся б эканомікі адукацыі, выяўлялі праблемы ў навучанні, кіраванні, рабоце настаўнікаў...»



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

«Шмат гаворыцца, што нешта трэба змяніць, каб пажаданае ў адукацыі стала рэальнасцю. Але гаварыць, не змяняючы і не спрабуючы, проста. Давайце прааналізуем, на чым грунтуецца працэс узаемадзеяння «настаўнік — вучань — школа», — прапануе **настаўніца беларускай мовы і літаратуры Юлія НЕКРАШ.** — Калі разглядаць гэта як адрэзак, то незразумела, што павінна стаяць наперадзе, а калі аналізаваць у форме трыкутніка, то зноў жа ўзнікае пытанне: што павінна стаць вяршыняй? А што б вы ўзнялі вышэй? Для мяне гэта, бясспрэчна, вучань.

Прааналізаваўшы план сваёй школьнай выхаваўчай і прадметнай работы, я высветліла, што мы працуем на... алімпіяды і навукова-практычныя канферэнцыі. У нас ёсць найлепшы вучань, найлепшы клас, найлепшы кабінет, настаўнік года... Складваецца такое ўражанне, што ўсё пабудавана на спаборніцтве: вучня з вучнем, настаўніка з настаўнікам, школы са школай, раёна з раёнам... Ну паспаборнічалі, ну перамаглі. І што засталося пасля гэтага марафона? Задавальненне? Хіба толькі ад таго, што гонка скончылася. У гэта паверу. Магчыма, яшчэ матэрыяльнае стымуляванне ў выглядзе прэміі... Але якія эмацыянальныя і псіхалагічныя выдаткі мы маем у выніку гэтага спаборніцтва? Колькі недапрацаваных урокаў засталося ў таго настаўніка, які ўзяў удзел хоць бы ў раённым этапе конкурсу «Настаўнік года»? Альбо колькі недавучаных тэм па іншых прадметах застаецца ў вучня-алімпіядніка...» Атрымліваецца, што вяршыня трыкутніка паварочваецца ў бок школы, бо гэтая перамога працуе на статус школы, павышае яе месца ў гарадскім ці раённым рэйтынгу. Але адукацыя — гэта не спорт!»

У сайта adukavanka.by ёсць раздзелы «Праблемы», «Рашэнні», «Праекты» і «Меркаванні». Кожны можа даслаць сваю праблему ці прапанаваць рашэнне. Таксама можна апублікаваць свой ці параіць іншы аналітычны артыкул пра адукацыю, каб ідэі і разуменне сітуацыі былі больш грунтоўныя. Замест пустых размоў прапануецца стварыць канкрэтныя апісанні таго, што бачыцца праблемамі для беларускай адукацыі па думку розных бакоў (настаўнікаў, вучняў, бацькоў, грамадства, органаў кіравання і г. д.), а таксама стварыць банк патэнцыйных рашэнняў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Грошы

# НАЯЎНЫЯ — МІНУС, А КАШТОЎНЫЯ ПАПЕРЫ — ПЛЮС

**Шырокая грашовая маса ў нашай краіне, якая ўключае наяўныя грошы ў абарачэнні, срокі насельніцтва і прадпрыемстваў на рахунках у банках, на 1 лістапада склала каля 45,072 млрд рублёў, зменшыўшыся ў параўнанні з паказчыкам на 1 кастрычніка на 0,5 %.**

Як паведамляе прэс-служба Нацыянальнага банка, аб'ём наяўных грошай у абарачэнні (грашовы агрэгат М0) за кастрычнік знізіўся да 3,415 млрд рублёў, або на 0,2 %. Больш істотныя змены адбыліся з актыўнай рублёвай грашовай масай (грашовы агрэгат М1), які ўключае наяўныя грошы ў абарачэнні і пераводныя дэпазіты ў нацыянальнай валюце (срокі на бягучых рублёвых рахунках, уклады да запатрабавання ў рублях, іншыя рахункі ў рублях). Гэтая рублёвая маса ў кастрычніку знізілася на 4,2 % і склала 8,792 млрд рублёў.

Грашовы агрэгат М2 (грашовая маса ў нацыянальным вызначэнні), які ўключае агрэгат М1 і іншыя дэпазіты ў нацыянальнай валюце, на 1 лістапада склаўся на ўзроўні 17,506 млрд рублёў, зменшыўшыся за кастрычнік на 3,3 %. А вось аб'ём каштоўных папер, выпушчаных банкамі ў нацыянальнай валюце, за кастрычнік вырас да 1,542 млрд рублёў, або на 11,8 %.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Факт

# БЕЗ ПРАВА НА ПАМЫЛКУ

**Сёлета за 10 месяцаў колькасць знойдзеных выбухованебяспечных прадметаў перавалiла ўжо за 30 тысяч. І ў асноўным гэтая «спадчына» дасталася нам ад абедзвюх сусветных войнаў. Таму ў лістападзе на базе праціміннай службы 2-й інжынернай брыгады быў створаны праціміны цэнтр Узброеных Сіл.**

— У сучасных ваенных канфліктах колькасць боеприпасаў, якія ўжываюцца, істотна вырасла, — зазначыў **начальнік інжынерных войскаў Узброеных Сіл — начальнік упраўлення інжынерных войскаў Генеральнага штаба Узброеных Сіл Андрэй КУРАКОЎ.** — Стала больш і выпадкаў ужывання самаробных выбуховых прылад. Натуральна, мы павінны былі знайсці на гэтыя выклікі адэкватны адказ. Мы павінны падняць на новы ўзровень падрыхтоўку сапёраў, павялічыць колькасць такіх спецыялістаў... І разлічваем, што стварэнне гэтага цэнтра дазволіць эфектыўна ўкараняць перадавы досвед.

Падрабязна аб рабоце навастворанага цэнтра чытайце ў адным з наступных нумароў «Звязды».

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## Надвор'е

# ЦЯПЛО НЕ СЫХОДЗІЦЬ

### Як адзначылі айчынныя сіноптыкі, тэмпературны фон на гэтым тыдні адпавядае пачатку кастрычніка

**Лістапад працягвае радаваць нас анамальным цяплом. У найбліжэйшыя дні шырокі антыцыклон, які раскінуўся над ніжняй Волгай, будзе аказваць пераважны ўплыў на надвор'е ў нашай краіне. Па перыферыі антыцыклону ў Беларусь працягне паступаць цёплае паветра з поўдня Еўропы. Таму цёплае без ападкаў надвор'е будзе і да пачатку наступнага тыдня, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Заўтра на працягу сутак таксама будзе пераважна без ападкаў. Месцамі чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс шасці градусаў, удзень будзе 5—12 цяпла, па паўднёвым захадзе краіны — нават да плюс 14 градусаў. Не чакаецца дажджоў і ў нядзелю. Месцамі ў гэты дзень магчымы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 2 да плюс 8 градусаў, удзень будзе 6—12 цяпла, па паўднёвым захадзе краіны прыгрэе да плюс 14 градусаў.

Па папярэдніх прагнозах нашых сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня надвор'е ў Беларусі будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску. У панядзелак і аўторак (18—19 лістапада) будзе без істотных ападкаў. Месцамі туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс сямі градусаў, а восць па ўсходзе краіны пры праясненнях месцамі паветра астудзіцца да 1—3 марозу. Удзень сонца ўсё расставіць на свае месцы — будзе 4—10 цяпла, па паўднёвым захадзе краіны нават да плюс 11—13 градусаў. Цалкам камфортна для сярэдзіны лістапада...

**Сяргей КУРКАЧ.**


**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды сроком на 3 (три) года имущества, принадлежащего УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги»**

**Лот № 1.** Право заключения договора аренды здания трансформаторной подстанции № 317, инв. № 110/С-102665. Площадь – 23 кв. м. Адрес: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Торфяная, д. 53А. **Начальная цена с НДС –** 97,18 бел. руб**. Задаток** – 9,72 бел. руб. **Шаг аукциона –** 5 %. **Размер ежемесячной арендной платы –** 12,19 баз. ар. вел. **Земельный участок –** кадастровый номер 141000000001002693, площадь 0,0053 га. Целевое назначение – размещение складов.

**Условия аукциона:** 1. Подписать договор аренды Объекта в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона. 2. Оплатить Продавцу стоимость, приобретенного на аукционе лота в течение 5 (пяти) банковских дней с даты подписания договора аренды объекта. 3. Оплатить Организатору аукциона стоимость услуги и стоимость затрат Организатора аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Расчет ежемесячной арендной платы выполнен в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29 марта 2012 г. № 150. Базовая арендная величина с 01.04.2019 равна 16 руб. 90 коп.

Цена продажи Лота не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Размер штрафа в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 составляет 1 000,00 белорусских рублей.

**Аукцион состоится 19.12.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by. **Продавец:** УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичская дистанция электроснабжения, 225406, г. Барановичи, ул. Железнодорожная, 1а, тел. 8 (0163) 49-55-14. **Организатор аукциона:** РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 9. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC BPSBBY2X. **Получатель –** РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. **Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе по продаже Лота № 1, проводимом 19.12.2019 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 17.12.2019 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Деницик Ольга Алексеевна, тел. 8 0163 49 55 14

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ**

**Организатор электронных торгов (продавец):** Унитарное предприятие «Клецкий производственно-пищевой завод», 222531, Минская область, Клецкий район, г. Клецк, ул. Кирова, д. 1, тел. +375 33 335 67 19.
**Оператор электронной торговой площадки:** ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».
**Торги проводятся 19.12.2019** на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by. Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме**.**

| № лота | Наименование предмета торгов; его местонахождение | Краткая характеристика | Начальная цена лота, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Здание колбасного цеха с оборудованием; Минская область, г. Клецк, ул. Кирова,1 | Фундамент бетонный, внутренние капитальные стены кирпичные, перекрытие междуэтажные ж/б, перекрытие подвальные ж/б, крыша совмещенная, полы бетонные, плиточные, окна ПВХ, проемы дверные дощатые | **821 299,54** | **82 129,00** |

**Окончание приема заявлений на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами** – 13.12.2019, до 15.00.
**Задаток** для участия в торгах перечисляется на текущий (расчетный) банковский счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка** – не позднее даты и времени окончания приема заявлений на участие в торгах. **Назначение платежа**: внесение суммы задатка для участия в электронных торгах рег. № ___ по заявлению № ___.
Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

*Победитель (единственный участник) торгов в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах торгов обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, иные платежи, указанные в протоколе.*

*Срок подписания договора купли-продажи недвижимого имущества и аренды земельного участка – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат, иных платежей, указанных в протоколе о результатах торгов*



**Вниманию предприятий, организации и индивидуальных предпринимателей!**

Фондом «Гродноблимущество» проводится аукцион по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района.

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ:

**1. Капитальное строение: здание фельдшерско-акушерского пункта с принадлежностями в Волковысском районе по адресу: д. Вехотница, 47, м47/1, Российский с/с Волковысского района.**

Аукцион состоится **28 ноября 2019 г. в 12.00.**

Заявки на участие в аукционах принимаются по адресу: город Гродно, улица 17 Сентября, 39.

Последний день подачи заявлений на участие в аукционах – **22 ноября 2019 г. до 17.00.**

Подробная информация размещена на сайте **http://www.region.grodno.by,** http://www.gki.gov.by.

Справки по телефонам: в городе Волковыске – (801512) 4 50 25; в городе Гродно – (80152) 623924, 623923, 623931.

УНП 500007288



**06.11.2019 общим собранием акционеров принято решение о реорганизации Закрытого акционерного общества «Бизнес-Рент»** (г. Минск, ул. Промышленная, д. 1, пом. 1, оф. 22) в форме присоединения.

**Депозитарий:** Закрытое акционерное общество «Агрокапитал», УНП 101000004, 220030, г. Минск, ул. Революционная, д. 6В.

# З КЛОПАТАМ ПРА ДЭМАГРАФІЮ



## У Магілёве ўвялі ў дзеянне цалкам абноўлены радзільны дом

**Гэтую падзею ў абласным цэнтры чакалі амаль шэсць гадоў. Сёлета рэканструкцыя — і днямі абноўлены раддом прыняў першых сваіх пацыентаў. Міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК, кіраўнік Магілёўшчыны Леанід ЗАЯЦ і памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Міхаіл РУСЫ ацанілі ўмовы і магчымасці, якія тут былі створаны.**

За час рэканструкцыі выгляд раддома гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі змяніўся амаль цалкам. Убачанае ўражвае — сучасныя аперацыйныя, рэанімацыя, палаты на двух чалавек, сістэмы апавяшчэння — у перынатальным цэнтры трэцяга ўзроўню створаны найлепшыя ўмовы. Пры жаданні парадзіха можа зняць сямейны пакой, дзе разам з жанчынай будуць знаходзіцца яе блізкія. Там прадугледжана нават міні-кухня.

— Тут рэалізаваны ўсе наватарскія дасягненні і ідэі, якія толькі існуюць у свеце, — падкрэсліў падчас прэзентацыі раддома **галоўны ўрач Магілёўскай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Павел АРЭХОЎСКІ.** — Новыя тэхналогіі дазволяць прымаць у рэканструяваным раддоме каля трох з паловай тысяч родаў у год. Тут створаны ўмовы для партнёрскіх родаў, вертыкальных і нават водных. На гэты выпадак тут ёсць гідрамасажная ванна. Скарыстацца паслугамі радзільнага дома змогуць як гарадскія пацыенткі, так і вясковыя. А калі з цяжкай паталогіяй, то і з усёй вобласці.

— Гэты цэнтр з'явіўся дзякуючы плённаму супрацоўніцтву рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады, — паведаміў міністр аховы здароўя Уладзімір Каранік. — Сучаснае абсталяванне, добрая атмасфера, цудоўны прафесійны калектыў. Сёння мы, як і нашы найбліжэйшыя суседзі, увайшлі ў дэмаграфічную яму, перажываем наступствы 90-х, калі быў спад нараджальнасці. Да таго ж нашы жанчыны пачалі нараджаць пазней і менш. Мы змагаемся за кожную цяжарнасць і кожнае дзіцячае жыццё. Гэтае аснашчэнне — яркае таму пацвярджэнне. Беспрэцэдэнтныя меры прымаюцца дзяржавай для падтрымкі шматдзетных сям'яў, і ёсць спадзяванні, што яны таксама паўплываюць.

А кіраўніцтва бальніцы ўжо марыць пра абнаўленне ўсёй установы аховы здароўя. Бальніца была пабудавана яшчэ ў пачатку мінулага стагоддзя і сёння не адпавядае патрабаванням часу. З 22 яе карпусоў дзве трэціны — гэта старая забудова.

Як адзначыў міністр, сёння ўзгоднена з Прэзідэнтам краіны і распрацоўваецца для кожнага рэгіёна Беларусі канцэпцыя апорных клінік. Магілёў — адзін з тых гарадоў, дзе з'явіцца такая ўстанова. Гэтая клініка будзе аказваць дапамогу не толькі магілёўчанам, але і жыхарам найбліжэйшых раёнаў.



— Згодна з даручэннем Прэзідэнта, мы павінны ўвесці ў дзеянне ўсе тыя сацыяльныя аб'екты, якія маюць для людзей вялікае значэнне, — паведаміў старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід Заяц. — І мы прынялі рашэнне пабудаваць новую бальніцу з усімі перадавымі тэхналогіямі, якія ёсць у свеце. Налета плануем знесці частку старых аб'ектаў, зрабіць праект, прайсці экспертызу і закласці падмурак новай медустановы. Ёсць рэальны клопат дзяржавы аб грамадстве, і ў нашых планах і надалей удзяляць павышаную ўвагу ўсім аб'ектам аховы здароўя.

Акрамя раддома ў Магілёве адкрылася абноўленае дзіцячае аддзяленне ў Глускай цэнтральнай раённай бальніцы — таксама з утульнымі пакоямі для пацыентаў і сучасным абсталяваннем. Налета будзе працягнутая рэканструкцыя іншых аддзяленняў бальніцы. Гэтымі днямі чакаецца адкрыццё тэрапеўтычнага корпуса цэнтральнай раённай бальніцы ў Асіповічах. У планах абласной улады налета завяршыць рэканструкцыю і цэнтральнай асіповіцкай паліклінікі.

— А калі казаць пра ўсе медыцынскія аб'екты вобласці, то мы плануем на працягу будучай пяцігодкі ўсе іх адрамантаваць, — падкрэсліў Леанід Заяц.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара і БелТА.**

# «Мы адчулі, што нам гатовы дапамагчы»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У Беларусі пражывае каля 700 хворых на фенілкетанурыю. Але рэч у тым, што захворванне ва ўсіх праяўляецца ў рознай ступені. Камусьці без асаблівых наступстваў можна ўжываць да 70 % звычайнай ежы. У Дзмітрыя цяжкая форма захворвання, якое тоіць небяспеку для розных сістэм арганізма. У некаторых выпадках хворыя паступова страчваюць навыкі самастойна сябе абслугоўваць, пісаць, размаўляць і іншае.

За час, які прайшоў з моманту нашай першай публікацыі, Дзмітрый пабываў у Турцыі на міжнароднай канферэнцыі па фенілкетанурыі. І гатовы далей змагацца за тое, каб хворыя ў нашай краіне мелі доступ да лячэбнага харчавання і новых метадаў лячэння.

— Калі мы сталі збіраць інфармацыю, то высветлілася, што ў нашай краіне ўсяго каля дзясятка дарослых пацыентаў гэтак жа, як і Дзіма, маюць патрэбу ў захаванні строгай дыеты. Мы хочам, каб выконвалася тое, што прадпісана па пратаколах лячэння: хворыя, якія жадаюць прытрымлівацца дыеты, атрымлівалі сумесь па паказаннях пасля 18 гадоў. Мы адчулі, што зараз з намі гатовы ісці на кантакт і дапамагчы вырашыць праблему, — кажа маці Дзмітрыя Кацярына Яроміна.

На нашу публікацыю адрэагавала Міністэрства аховы здароўя. Мы атрымалі каментарый за подпісам **першага намесніка міністра Дзмітрыя ПІНЕВІЧА.** Прыводзім яго з невялікімі скарачэннямі.

«Дыета пры фенілкетанурыі прадугледжвае выключэнне прадуктаў жывёльнага паходжання і раслінных прадуктаў з высокім утрыманнем бялку, абмежаванне натуральнага бялку з улікам індывідуальнай пераноснасці фенілаланіну. Паступленне бялку да адпаведнай узросту патрэбы кампенсуецца за кошт прыёму амінакіслотных сумесяў. Для пашырэння дыеты выкарыстоўваюцца спецыяльныя прадукты з нізкай колькасцю бялку.



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Схема, узрост і паўната кампенсацыі затрат на гэтыя прадукты харчавання ў розных краінах адрозніваюцца. У Рэспубліцы Беларусь у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Міністэрствам аховы здароўя ажыццяўляецца забеспячэнне дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў і цяжарных жанчын, хворых на фенілкетанурыю, лячэбнымі харчавальнымі сумесямі (без фенілаланіну) за кошт сродкаў мясцовага бюджэту.

З даведкі: у Расійскай Федэрацыі ў адпаведнасці з пастановай урада... пацыенты ўсіх узростаў маюць права на бясплатнае забеспячэнне сумесямі амінакіслот і безбялковымі прадуктамі. Дзеці забяспечваюцца сумесямі амінакіслот за кошт мясцовых бюджэтаў, астатнія пытанні вырашаюцца на месцах (у асноўным прадукты і сумесі для дарослых не кампенсуюцца).

Згодна з інфармацыяй са справаздачы Еўрапейскага таварыства фенілкетанурыі:

Нідэрланды — кошт сумесяў кампенсуецца страхоўкай, прадукты не кампенсуюцца, але пацыенты, якія іх набываюць, маюць падатковыя льготы. Швецыя — кошт сумесяў кампенсуецца дзяржавай, схема кампенсацыі адрозніваецца ў розных рэгіёнах; прадукты кампенсуюцца дзяржавай для дзяцей да 16 гадоў. Іспанія — кошт сумесяў кампенсуецца сістэмай аховы здароўя, у некаторых рэгіёнах кошт прадуктаў часткова кампенсуецца страхоўкай. Вялікабрытанія — кошт сумесяў і нізкабялковых прадуктаў харчавання пацыенты атрымліваюць па рэцэпце: для дзяцей бясплатна, дарослыя набываюць сумесь і прадукты па рэцэпце з аплатай. Польшча — нацыянальная сістэма аховы здароўя кампенсуе асноўную частку кошту сумесяў; нізкабялковыя прадукты не кампенсуюцца.

Цяпер Міністэрствам аховы здароўя сумесна з зацікаўленымі профільнымі спецыялістамі адпрацавана пытанне магчымасці паляпшэння забеспячэння прадуктамі харчавання грамадзян, хворых на фенілкетанурыю.

У межах рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 21 ліпеня 2014 года № 360 (у рэдакцыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 22.12.2018 № 490), пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 20 чэрвеня 2019 года № 406 устаноўлены пералік асобных невылечных захворванняў і пералік тавараў медыцынскага прызначэння і спецыялізаванай харчовай прадукцыі дыетычнага лячэбнага харчавання, якую ўвозяць на мытную тэрыторыю Еўразійскага эканамічнага саюза ў Рэспубліцы Беларусь у міжнародных паштовых адпраўленнях і (ці) тых, якія дастаўляюць перавозчыкам, на якія не распаўсюджваецца дзеянне частак першай і другой падпункта 1.1 пункта 1 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 21 ліпеня 2014 года № 360. (Маюцца на ўвазе паштовыя адпраўленні з-за мяжы, штомесячны ліміт на якія для фізічных асоб абмежаваны. Хворыя на фенілкетанурыю могуць заказваць неабходныя ім прадукты і сумесі ў замежных інтэрнэт-крамах без ліміту кошту і вагі. — **Аўт.**).

У пералік невылечных захворванняў уключана, у тым ліку, захворванне «фенілкетанурыя», а ў пералік спецыялізаванай харчовай прадукцыі дыетычнага лячэбнага харчавання ўключаны нізкабялковыя прадукты харчавання і сухая сумесь на аснове сумесі амінакіслот без фенілаланіну.

Для ўключэння ў пералік фізічных асоб, якія пакутуюць ад асобных невылечных хвароб, пацыентам неабходна звярнуцца ў дзяржаўную арганізацыю аховы здароўя па месцы жыхарства (месцы знаходжання, вучобы, службы). Пасля атрымання згоды ад пацыента дзяржаўнай арганізацыяй аховы здароўя ажыццяўляецца перадача неабходных звестак ва ўпаўнаважаную арганізацыю для ўключэння інфармацыі ў Пералік фізічных асоб з наступнай перадачай звестак у мытныя органы.

Назіранне пацыентаў з фенілкетанурыяй ажыццяўляецца ў дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя ў адпаведнасці з клінічнымі пратаколамі дыягностыкі, лячэння і дыспансернага назірання... зацверджаным загадам Міністэрства аховы здароўя ад 7 жніўня 2009 года № 781, а таксама інструкцыяй аб парадку правядзення дыспансерызацыі...

На кансультацыю да ўрача-генетыка і абследаванне пацыенты з фенілкетанурыяй, у тым ліку старэйшыя за 18 гадоў, могуць звярнуцца ў медыка-генетычныя цэнтры (аддзяленні, кансультацыі) па месцы жыхарства і ў дзяржаўную ўстанову «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Маці і дзіця».

У 2017 годзе апублікаваны Еўрапейскія рэкамендацыі па дыягностыцы і лячэнні фенілкетанурыі. Рэкамендацыя аб падаўжэнні дыеты ў дарослых заснавана на шэрагу даследаванняў, якія перш за ўсё датычацца неўралагічных і кагнітыўных парушэнняў. Допушчальныя ўзроўні фенілаланіну ў крыві ў адпаведнасці з еўрапейскімі рэкамендацыямі залежаць ад узросту пацыента: да 12 гадоў — 120—360 мкмоль/л, старэйшых за 12 гадоў — 120—600 мкмоль/л. Гэта рэкамендаваны ўзровень фенілаланіну пры правядзенні лячэння. Калі такі ўзровень фенілаланіну мае месца без правядзення лячэння, назначэння тэрапіі не патрабуецца...

Амінакіслотныя сумесі і нізкабялковыя прадукты харчавання — гэты тыя неабходныя рэчывы, якія дазваляюць пацыентам з фенілкетанурыяй пазбегнуць кагнітыўных парушэнняў і змен з боку нервовай сістэмы. Міністэрства аховы здароўя плануе здзяйсняць работу па гэтым кірунку ў цесным узаемадзеянні з грамадскай арганізацыяй пацыентаў «Беларускае грамадскае аб'яднанне хворых на фенілкетанурыю».

**Алена КРАВЕЦ.**

Жыццёвінкі

# Не бяры чужога

## КАЛІ НЕ СПІЦЦА...

Мала радасці, калі старому чалавеку не спіцца. Не бярэ сон, і ўсё тут. Здагадваюся, што тады робяць людзі сталага веку. Адны проста ляжаць у ложку і ўспамінаюць пражытыя дні. Стараюцца, вядома ж, прыгадаць найбольш яркія старонкі, а прэч гоняць усё тое, што апякала некалі сэрца болем, хаця ад такога пазбавіцца не так проста — нават не зважаючы на пройдзены час, не зарастаюць бадылллём горкія здарэнні-выпадкі. Іншыя бяруць у рукі кнігу, насоўваюць на нос акуляры — і чытаюць. Трэція, мусіць жа, ідуць на кухню, гатуюць якую-небудзь страву на снеданне альбо напаўняюць кубак духмяным чаем і сядзяць, смакуючы яго. І чакаюць раніцы...

Ніна Сцяпанаўна, настаўніца-пенсіянерка, прызнаецца:

— Я ж улетку варочаюся-варочаюся ў ложку, галава пухне ад розных думак і ўспамінаў... Тады што я раблю — іду у сад, там у мяне табурэтка пад яблыняй стаіць, спецыяльна занесла, сядаю на яе і радуюся жыццю. Такая прыгажосць вакол! Паветра чыстае, свежае, дыхаеш не надыхацца. А вёска спіць. Адпачывайце, адпачывайце, людзі. Мне на працу не ісці, калі сон нагорнецца, магу і ўдзень яго ўважыць.

А калі пачынае віднець, на вуліцы з'яўляюцца першыя людзі, то я хаваюся ад іх у хаце, бо яшчэ, чаго добрага, не так мяне зразумеюць. Чаго гэта, скажуць, Сцяпанаўна пад яблыняй кожнага дня сядзіць і сядзіць, ці не здурнела? Не ўсё людзям трэба паказваць, для ўсіх сваю душу не расхінеш... Не будзеш жа ўсім апавядаць, што я, сустракаючы новы дзень, зараджаюся такой энергіяй, што мае ногі потым не паспяваюць за галавой. І тое хачу зрабіць, і гэтае. А мне ж ужо дзевяноста першы пайшоў... Не жартачкі. І ведаеце, аб чым больш за ўсё шкадую? Вельмі многіх вучняў я пераджыла... Ночку пра гэта асабліва думаецца... Тады я адрываю галаву ад падушкі, іду ў сад... На свой табурэт... Там мне намнога лягчэй...

Я і сапраўды бачыў тую табурэтку пад яблыняй у садзе Ніны Сцяпанаўны, калі ўлетку неадназрова праходзіў каля яе падворка. Аднак, прызнаюся, да споведзі былой настаўніцы не ведаў, для чаго яна там стаіць. Цяпер жа, глыбокай восенню, не відаць табурэткі пад старым, але яшчэ пладавітым дрэвам, лісце з якога асыпалася на дол і ляжыць там залацістым дыванком. Стала холадна, і Ніна Сцяпанаўна занесла яе ў сенцы, мусіць жа. Да цёплых дзён.

Вельмі хацелася б, каб яна, калі ўжо не спіцца, яшчэ не адно лета выносіла гэты табурэт у свой сад...

## НАЧНЫЯ СВАЯКІ

**Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232)23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8(029)126-66-62.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению антикризисного управляющего частного предприятия «Аналитик-центр» в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества ОАО «Молодечнолес» в составе:

ОБОРУДОВАНИЕ:

| № лота | Наименование объекта | Инвентарный номер согласно данным бух. учета | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Сумма задатка (10 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Резак ацетиловый | | **72,00** | 7,00 |
| 2 | Компьютеры (4 шт.), принтер Canon MF44101, ПЭВМ «Сильверадо» LG (2 шт.), факсы «Панасоник» (3 шт.), набор «Премьер-1», мебель, спецодежда, котел стационарный, трансформатор ТС-10 КВ, шкаф КТП-25/10 | | **597,21** | 59,00 |

С подробным списком имущества можно ознакомиться у организатора торгов.

**Стоимость лота № 1 снижена на 10 %.**
**Стоимость лота № 2 снижена на 50 %.**
НЕДВИЖИМОЕ ИМУЩЕСТВО:

| № лота | Наименование объекта, сведения о земельном участке (площадь, кадастровый номер) | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 3 | **Здание РММ** *(инв. № по бух. учету 01-184)*, общ. пл. 972,1 кв. м, **здание конторы** (*инв. № по бух. учету 01-178*), общ. пл. 110 кв. м, **здание склада** (*инв. № по бух. учету 01-179*), общ. пл. 253,4 кв. м, **здание арочного сооружения** (*инв. № по бух. учету 05-574*), общ. пл. 136,8 кв. м, **здание столовой** (*инв. № по бух. учету 01-019*), общ. пл. 64,5 кв. м, **здание столовой** (*инв. № по бух. учету 11-153*), общ. пл. 135,3 кв. м, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 224050100002000633 площадью 1,3286 га по адресу: Витебская область, г. Поставы, ул. Вокзальная | **64 791,81** | 6 479,00 |

**Стоимость лота № 3 снижена на 90 %.**
ДЕБИТОРСКАЯ ЗАДОЛЖЕННОСТЬ:

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Сумма задатка (10 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 4 | **Дебиторская задолженность в размере 181 715,81** белорусского рубля | **6 541,77** | 654,00 |

**Со списком дебиторов можно ознакомиться у организатора торгов.**
**Стоимость лота № 4 снижена на 90 %.**
**Условия аукциона:**
– имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведения данного платежа;
– на Покупателя возлагаются расходы, понесенные организатором торгов при проведении торгов по продаже имущества должника, в том числе оплата за размещение сведений о торгах в СМИ;
– Покупатель обязан за свой счет принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ, демонтажа;
– на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учет приобретаемого имущества за свой счет.
В соответствии с абзацем 4 п. 1.2 Указа Президента Республики Беларусь от 05.02.2013 № 63 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)» государственная регистрация создания капитальных строений, которые выставлены на торги без наличия документов, будет осуществляться в установленном порядке по заявлению покупателя и за его счет.
Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.
**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.
<u>**Победитель аукциона (единственный участник аукциона)**</u> **в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона <u>оплачивает вознаграждение</u> в размере 10 % от цены продажи предмета аукциона и <u>возмещает затраты</u> на организацию и проведение результативного аукциона.**
Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:
– заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;
– для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);
– для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);
– для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);
– для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.
При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.
Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.
Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до даты их проведения.
Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяются условиями о проведении торгов, ознакомиться с которыми можно в дни приема заявлений на участие в торгах, а также на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 11.09.2019, 15.10.2019.
Аукцион состоится **02.12.2019 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.11.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Більярд. Стары. Холад. Баль. Дождж. Ясна. Бант. Абарот. Ура. Агу. Воўк. Акт. Накал. Бора. Скалалаз. **Па вертыкалі:** Параход. Ліса. Ягада. Дрыль. Лыжка. Дажбог. Баян. Лён. Ступа. Азарт. Ату. Адвакат. Рак. Клара. Жаба. Кол. Лаз.

**Склаў Юрый ФАЛІНСКІ,**
*г. Мінск.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.36 | 17.11 | 8.35 |
| Віцебск — | 8.31 | 16.56 | 8.25 |
| Магілёў — | 8.26 | 17.01 | 8.35 |
| Гомель — | 8.17 | 17.04 | 8.47 |
| Гродна — | 8.50 | 17.28 | 8.38 |
| Брэст — | 8.45 | 17.34 | 8.49 |

## Месяц

*Поўня 12 лістапада. Месяц у сузор'і Рака.*

## Імяніны

*Пр.* Канстанціна.
*К.* Амеліі, Марыі, Альберта, Артура, Леапольда.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## Даты · Падзеі · Людзі

**15 ЛІСТАПАДА**

**У краіне**

**1884** год — нарадзіўся Мацвей Іванавіч Яворскі, гісторык, акадэмік НАН Беларусі (1928), акадэмік Усеўкраінскай акадэміі навук (1929), доктар гісторыі культуры (1929), прафесар. У 1930-м пазбаўлены звання акадэміка. Арыштаваны ў 1931-м, расстраляны ў 1937 годзе. Рэабілітаваны ў 1989-м. У 1991 годзе адноўлены ў званні акадэміка АН Украіны і ў 1994-м — АН Беларусі.

**1924** год — нарадзіўся Анатоль Ільіч Зосік, поўны кавалер ордэна Славы. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з сакавіка 1944-га. Удзельнік вызвалення Беларусі, Польшчы, баёў у Германіі. Камандзір стралковага аддзялення сяржант Зосік вызначыўся ў баях на тэрыторыі Польшчы і Германіі. Да 1975 года працаваў у органах МУС Беларусі. Памёр у 2003 годзе.

**1925** год — у Мінску ў эфір выйшла першая перадача беларускага радыё. Радыёстанцыя РВ-10 імя Саўнаркама БССР стала транслявацца перадачы ў радыусе да 300 кіламетраў працягласцю 30 хвілін у суткі. У Беларусі стала фарміравацца радыёперадавальная сетка.



**1939** год — нарадзіўся Міхаіл Аляксандравіч Слямнёў, беларускі філосаф, доктар філасофскіх навук (1982), прафесар (1982), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1989). У 1962 годзе скончыў Віцебскі педагагічны інстытут. З 1971-га працаваў у Інстытуце філасофіі і права АН Беларусі, у Віцебскім педагагічным інстытуце, з 1990-га дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, старшыня камісіі па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах, з 1995-га генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку (Польшча). З 1998 года загадчык кафедры ў Віцебскім філіяле Інстытута сучасных ведаў, з 2007-га — у Віцебскім універсітэце. Аўтар навуковых прац па праблемах логікі, метадалогіі навуковага пазнання і філасофскім аспекце прыродазнаўства.

**1954** год — нарадзіўся Уладзімір Васілевіч Гладкевіч, беларускі графік і жывапісец. Аўтар станковых графічных твораў «Вяртанне Францыска Скарыны», «Хворыя воблакі», аформіў і праілюстраваў паэму «Тарас на Парнасе».

**У свеце**

**1874** год — нарадзіўся Аўгуст Крог, дацкі навуковец-фізіёлаг, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіялогіі і медыцыне (1920). Адкрыў механізм рэгуляцыі капілярнага кровазвароту і ўстанавіў яго значэнне для абмену рэчываў. Памёр у 1949 годзе.

**1884** год — з ініцыятывы канцлера Германіі Ота фон Бісмарка ў Берліне адкрылася міжнародная канферэнцыя 14 дзяржаў Заходняй Еўропы па афрыканскіх пытаннях, якая наканавала каланіяльны захоп Афрыкі і пацвердзіла формы размеркавання і ўласнасці на зямлю, што існавалі дагэтуль. Канферэнцыя скончылася 26 лютага 1885 года.

**1904** год — амерыканец Кінг Кэмп Жылет запатэнтаваў брытву са зменнымі лёзамі.

## УСМІХНЕМСЯ

**Пашанцавала тым, каму цяпер за 40.**

**Столькі глупстваў у маладосці нарабілі, а доказаў няма, таму што ў той час не было інтэрнэту.**

— Па статыстыцы, мужчыны здраджваюць у тры разы часцей, чым жанчыны. Пра што гэта сведчыць?

— Пра тое, што статыстыку збірала жанчына.

**Джэніфер Эністан трапіла ў Кнігу рэкордаў Гінеса як уладальніца самага прыгожага былога мужа.**

А быў жа практычна здаровы, пакуль... у медыцынскім цэнтры не даведаліся, што я фінансавы дырэктар буйнога холдынга.




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае міністэрствам інфармацыі рэспублікі беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3880.
Нумар падпісаны ў 19.30 14 лістапада 2019 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

15 лістапада 2019 г. № 45 (530)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


СПЕЦВЫПУСК




Фота БелТА.

# ВЫБАР КОЖНАГА

**Ужо зусім хутка стане вядомы склад новага парламента: выбары ў верхнюю палату прайшлі 7 лістапада, і іх вынікі ўжо абвешчаны ЦВК, а 17 лістапада — у асноўны дзень усенароднага галасавання — грамадства вызначыцца са сваімі прадстаўнікамі ў ніжнюю палату. Ад таго, хто будзе працаваць над заканатворчасцю, залежыць многае... Без пафасу кажучы, але наша будучыня: вядома, дзейнасць парламента закранае ўсе сферы нашага грамадства, таму так важна, каб ён складаўся з прафесіяналаў у сваёй галіне справы.**

**І сённяшні нумар мы амаль цалкам прысвяцілі тэме парламенцкіх выбараў: вы даведаецеся, як фарміруецца парламент, каго абралі дэпутаты Саветаў базавага ўзроўню ў палату тэрытарыяльнага прадстаўніцтва, як адбываецца датэрміновае галасаванне на выбарчых участках у рэгіёнах. А яшчэ мы спыталі вядомых персон і самых звычайных выбаршчыкаў, якімі якасцямі, з іх пункту гледжання, павінен валодаць сапраўдны дэпутат, і падрыхтавалі «сярэдні» партрэт кандыдата на статус народнага абранніка.**

**Больш падрабязна — на стар. 2—13.**

ТРЭБА ВЕДАЦЬ!

## Галасую — як, дзе, калі?

### Толькі ў першы дзень датэрміновага галасавання на парламенцкіх выбарах прагаласавала амаль пяць працэнтаў выбаршчыкаў

**Прагнозы старшыні Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзіі ЯРМОШЫНАЙ спраўджваюцца: беларусы аддаюць перавагу датэрміноваму галасаванню, каб вызваліць адзіны на тыдні выхадны. Толькі 12 лістапада прагаласавала 4,69 працэнта грамадзян. У электаральныя лідары выйшла Віцебшчына — там на ўчасткі за першы дзень прыйшло 5,52 працэнта выбаршчыкаў.**

І ўсё ж галоўны дзень у выбарчай кампаніі — нядзеля 17 лістапада. І паколькі ён яшчэ і вельмі адказны, у выбаршчыкаў часам з'яўляюцца пытанні. Як правільна аддаць свой голас, калі ісці на ўчастак і што рабіць, калі памыліўся ў бюлетэні? Вывучаем разам інфармацыю ЦВК і даём адказы.

**— У нядзелю я буду дома, ужо запланаваў паход на выбары. Калі ісці і што трэба ўзяць з сабой?**

— Галасаванне ў дзень выбараў праводзіцца з 8 да 20 гадзін. На ўчастках для галасавання, утвораных у воінскіх часцях, санаторыях, прафілакторыях, дамах адпачынку, бальніцах і іншых арганізацыях аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах, участковыя камісіі могуць аб'явіць галасаванне скончаным раней за 20 гадзін, калі прагаласавалі ўсе выбаршчыкі, уключаныя ў спіс.

Для галасавання выкарыстоўваюцца стацыянарныя (у памяшканні для галасавання) і пераносныя (для выбаршчыкаў, якія па стане здароўя ці іншых уважлівых прычынах не могуць прыйсці ў дзень выбараў у памяшканне для галасавання) скрыні.

Бюлетэнь выдаецца грамадзяніну пры паказе пашпарта альбо ваеннага білета, службовага пасведчання работніка дзяржаўнага органа, пасведчання кіроўцы, пенсійнага пасведчання, пасведчання інваліда (з фота), студэнцкага білета, даведкі органаў унутраных спраў, якая пацвярджае асобу ў выпадку страты пашпарта.

стар. 13

СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### Даступна і зразумела




Як фарміруецца парламент і які тэрмін паўнамоцтваў народных абраннікаў, даведаецеся з нашай інфаграфікі. стар. 2

### Хто стаў сенатарам?



ЦВК агучыў вынікі выбараў у верхнюю палату беларускага парламента, а «МС» паглядзела, хто ёсць хто. стар. 3

### Першыя бюлетэні



Як стартавала датэрміновае галасаванне ў Гомелі, чытайце ў рэпартажы нашага ўласнага карэспандэнта. стар. 4

### Ад шампіньёнаў да рыкоты



Дэпутаты паглядзелі, як мясцовыя ўлады садзейнічаюць развіццю малога і сярэдняга бізнесу ў Шчучынскім раёне. стар. 14

### Крокі да экалогіі




Навошта ў Беларусі распачалі ўнікальную вытворчасць упакоўкі з... кукурузы? стар. 16

# ПАРЛАМЕНТ БЕЛАРУСІ




**Парламент — Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь — прадстаўнічы і заканадаўчы орган — складаецца з Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі. Тэрмін паўнамоцтваў — 4 гады**

## Палата прадстаўнікоў
(ніжняя палата парламента)



**Склад — 110 дэпутатаў**



Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў абіраюцца непасрэдна грамадзянамі

! Дэпутатам Палаты прадстаўнікоў можа быць грамадзянін Беларусі, які дасягнуў 21-гадовага ўзросту

## Савет Рэспублікі
(верхняя палата парламента)



**Склад — 64 прадстаўнікі**





Членаў Савета Рэспублікі абіраюць дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню (ад кожнай вобласці і горада Мінска па восем членаў), восем — прызначаюцца Прэзідэнтам

! Членам Савета Рэспублікі можа быць грамадзянін Беларусі, які дасягнуў 30-гадовага ўзросту і жыве на тэрыторыі адпаведнай вобласці, горада Мінска не менш за 5 гадоў.

## Калі галасаванне?



У Палату прадстаўнікоў — **17 лістапада 2019 года**

У Савет Рэспублікі — **7 лістапада 2019 года**

**На думку старшыні Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзіі ЯРМОШЫНАЙ, выбары прайшлі ў прыўзнятай атмасферы, дастойна і з яркімі выступленнямі.**

«Яны не проста адбыліся ў дзень дзяржаўнага свята, а традыцыйна суправаджаюцца святочнымі мерапрыемствамі кшталту канцэртаў, у пэўным плане з'яўляюцца пафаснымі — у добрым сэнсе гэтага слова», — сказала кіраўнік ЦВК журналістам перад пасяджэннем.

Лідзія Ярмошына, якая прысутнічала на выбарах у Магілёве, цалкам задаволена працэсам галасавання. Па водгуках членаў ЦВК, якія прысутнічалі ва ўсіх абласцях і Мінску, у іншых рэгіёнах выбары прайшлі аналагічна.

Чвэрць новага Савета Рэспублікі склалі жанчыны, адзінаццаць членаў працягнуць работу з дзейнага склікання, адзін выбраны член сёння з'яўляецца дэпутатам Палаты прадстаўнікоў. Яшчэ восем членаў верхняй палаты беларускага парламента мае права назначыць кіраўнік дзяржавы.

У пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў базавага ўзроўню ў абласцях і пасяджэнні дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета ўдзельнічала значна больш за палову агульнай колькасці дэпутатаў, выбраных у адпаведныя Саветы. Ад кожнага мясцовага Савета базавага ўзроўню на пасяджэннях прысутнічала больш за чвэрць дэпутатаў.

Такім чынам, усе неабходныя патрабаванні пры правядзенні пасяджэнняў вытрыманы, дакументы ў Цэнтрвыбаркам паступілі своечасова. Асаблівых меркаванняў членаў падліковых камісій і заяў іншых асоб аб парушэннях патрабаванняў Выбарчага кодэкса падчас галасавання і падліку галасоў камісія не атрымала. Гэта адзначыла **сакратар Цэнтрвыбаркама Алена ДМУХАЙЛА.**

«Усе кандыдаты ў члены Савета Рэспублікі ад абласцей і Мінска атрымалі вялікую падтрымку сваіх дэпутатаў. У сярэднім ад 90 да

## Акцэнт

**У Мінскай гарадской ратушы адбылося пасяджэнне Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў па выбарах членаў Савета Рэспублікі. Перад галасаваннем усе восем кандыдатаў агучылі свае праграмы.**

Савет Рэспублікі, як вядома, з'яўляецца палатай тэрытарыяльнага прадстаўніцтва, а яго асноўная функцыя — заканатворчасць. Наяўнасць у новым складзе верхняй палаты кваліфікаваных юрыстаў са шматгадовым і багатым досведам работы ў розных галінах права — залог поспеху яго дзейнасці. Таму паўторнае выбранне старшыні Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў Віктара ЧАЙЧЫЦА ўяўляецца лагічным. Ён, дарэчы, у папярэднім скліканні Савета Рэспублікі пра-

ХТО ЁСЦЬ ХТО?

# РОЗНЫЯ ЎЗРОСТЫ, РОЗНЫЯ СФЕРЫ

## На пасяджэнні ЦВК зарэгістраваны 56 членаў Савета Рэспублікі сёмага склікання

100 працэнтаў дэпутатаў базавага ўзроўню, якія ўдзельнічалі ў пасяджэнні, падтрымлівалі вылучаных кандыдатаў», — дадала яна.

Алена Дмухайла паведаміла, што палова выбраных членаў Савета Рэспублікі мае ўзрост паміж 50 і 60 гадамі. Трое сенатараў маладзейшыя за сорак гадоў, чацвёра — старэйшыя за шэсцьдзясят, 37 працэнтаў — асобы ва ўзросце ад 40 да 50 гадоў.

«Узроставае прадстаўніцтва аптымальнае», — лічыць Алена Дмухайла.

Прадстаўляюць выбраныя члены Савета Рэспублікі розныя сферы дзейнасці. Больш за ўсё сенатараў — 41 працэнт — традыцыйна занятыя ў сферы адукацыі, культуры, навукі і аховы здароўя. Амаль адзінаццаць працэнтаў сенатараў прадстаўляюць прамысловасць, транспарт і будаўніцтва, каля адзінаццаці працэнтаў членаў верхняй палаты — сельскую гаспадарку.

Калі казаць па персаналіях больш дакладна, хіба што варта пералічыць прозвішчы ўсіх абраных членаў Савета Рэспублікі новага склікання, інфармацыя пра якіх размешчана на сайце ЦВК. Такім чынам, інтарэсы **Брэсцкай вобласці** будуць прадстаўляць цяперашні старшыня абласнога Савета дэпутатаў Юрый НАРКЕВІЧ, а таксама яго калега па дэпутацкім корпусе — старшыня Жабінкаўскага раённага Савета дэпутатаў Анатоль ШАЛТАНЮК. Абраны ў якасці сенатараў Аляксандр КАРПІЦКІ, галоўны ўрач абласной бальніцы; Рыгор ПРАТАСАВІЦКІ, старшыня Столінскага раённага выканаўчага камітэта; Ірына САЧКОЎСКАЯ, загадчыца натарыяльнай канторы горада Пінска, і Тамара ШАТЛІКАВА, старшыня абласной калегіі адвакатаў. Сферу вытворчасці гэтага рэгіёна прадстаўляць генеральны дырэктар ААТ «Птушкафабрыка «Дружба» Васіль МАРКЕВІЧ і дырэктар ААТ «Парахонскае» Уладзімір ХРАЛЕНКА.

**Віцебшчыну** ў верхняй палаце беларускага парламента зноў будуць прадстаўляць сенатары, якія працавалі ў папярэднім скліканні, — Юрый ДЗЕРКАЧ, загадчык галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя аблвыканкама, Алена ПАНЦЮХОВА, дырэктар РУП «Тэлерадыёкампанія «Віцебск», і Анатоль ШЧАСНЫ, рэктар Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта. Сярод новых імёнаў — Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ, старшыня Наваполацкага гарвыканкама; Алег ЖЫНГЕЛЬ, начальнік рэгіянальнай дырэкцыі па Віцебскай вобласці ААТ «Беларапрамбанк»; Ірына ЛЯЎКОВІЧ, начальнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг аблвыканкама; Уладзімір МАЦВЕЕЎ, генеральны дырэктар КПРБУП «Віцебскаблдарбуд», і Таццяна ПАЛУШКІНА, дырэктар Полацкага каледжа Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**Гомельскую вобласць** у Савеце Рэспублікі будуць прадстаўляць Таццяна АБЕЛЬ, мастацкі кіраўнік заслужанага аматарскага калектыва Рэспублікі Беларусь народнага цырка імя Валерыя Абеля; Уладзімір КАТОВІЧ, загадчык аддзялення мікрахірургіі вока № 1 абласной спецыялізаванай клінічнай бальніцы; Аляксей НЯВЕРАЎ, старшыня абласнога аб'яднання арганізацый прафсаюзаў, якія ўваходзяць у Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі; Алег СЛІНЬКО, дырэктар КСУП «Саўгас-камбінат «Зара»; Ала СМАЛЯК, старшыня абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа; Андрэй ШЫШКІН, галоўны рэдактар рагачоўскай раённай газеты «Свабоднае слова»; Фелікс ЯШКОЎ, начальнік Гомельскай мытні. Другое скліканне запар у якасці сенатара будзе выконваць свае функцыі Аляксандр ЛЯХАЎ, генеральны дырэктар дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Беларуснафта» — генеральны дырэктар РУП «Вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта».



Фота БелТА.

**Гродзеншчыну** ў 7-м скліканні прадставяць два члены Савета Рэспублікі папярэдняга склікання: рэктар дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Віктар СНЯЖЫЦКІ і старшыня сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Азёры» Гродзенскага раёна Аляксандр ШЫШКО. Ад сферы прамысловай вытворчасці і пераапрацоўкі абраны Валянцін БАЙКО, намеснік дырэктара па развіцці сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Контэ Спа». Астатнія сенатары ад гэтага рэгіёна прадстаўляюць сацыякультурную сферу: Віктар ЛІСКОВІЧ, намеснік старшыні аблвыканкама, які курыруе адпаведны кірунак; Ігар ГЕДЗІЧ, дырэктар абласнога драматычнага тэатра; Алег РАМАНАЎ, першы прарэктар Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы; Эльвіра САРОКА, дырэктар Навагрудскага дзяржаўнага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя, і Кацярына СЕРАФІНОВІЧ, галоўны рэдактар «Лідскай газеты».

Што датычыцца **Магілёўшчыны,** то ад гэтага рэгіёна былі абраны Віктар АНАНІЧ, старшыня праўлення ААТ «Ашчадны банк «Беларусбанк»; Дзмітрый ВАРАНЮК, першы сакратар ЦК грамадскага аб'яднання БРСМ; Алег ДЗЯЧЭНКА, прарэктар па вучэбнай рабоце Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова; Ігар КАСКО, галоўны ўрач абласной дзіцячай бальніцы; Аляксей КУШНАРЭНКА, генеральны дырэктар дзяржаўнага вытворчага аб'яднання па паліве і газіфікацыі «Белпаліўгаз»; Валерый ПАЛІШЧУК, начальнік Магілёўскага інстытута МУС Беларусі, і Алег ПОРТНІК, дырэктар УКСП «Саўгас «Дабраволец». А Сяргею АНЮХОЎСКАМУ, дырэктару ААТ «Чырвоны Харчавік», дэпутаты Саветаў базавага ўзроўню зноў даверылі прадстаўляць інтарэсы свайго рэгіёна ў верхняй палаце беларускага парламента — другое скліканне запар.

Ад **Міншчыны** ў Савет Рэспублікі абралі старшыню абласнога Савета дэпутатаў Наталлю ЯКУБІЦКУЮ. Пераемнасць традыцый у новым скліканні будуць працягваць Іван ГАЛАВАТЫ, генеральны дырэктар ААТ «Беларуськалій», і Алег СУКОНКА, дырэктар РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава. Дарэчы, прадстаўляць рэгіён у верхняй палаце беларускага парламента будзе і дэпутат Палаты прадстаўнікоў 6-га склікання Валерый ГАЙДУКЕВІЧ. Сярод новых імёнаў — Аляксандр БАЧЫЛА, начальнік галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінаблвыканкама; Алена ЗЯБЛІКАВА, старшыня Барысаўскага раённага аб'яднання арганізацый прафсаюзаў, якія ўваходзяць у ФПБ; Каліна КАПУЦКАЯ, дырэктар СШ № 14 Маладзечна, і Уладзімір ЛУК'ЯНАЎ, генеральны дырэктар ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі».

Першая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі сёмага склікання павінна прайсці да 7 снежня. Дакладная дата стане вядома пасля 22 лістапада, калі будуць падведзены вынікі выбараў у Палату прадстаўнікоў. Адначасова будзе прынята рашэнне па даце першай сесіі ніжняй палаты парламента, выбары ў якую адбудуцца ў нядзелю, 17 лістапада.

**Вольга АНУФРЫЕВА, Варвара МАРОЗАВА.**

РЭПАРЦЁР

# на ўзаемадзеянні з мясцовай уладай

цаваў намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве. Цяпер мае намер удзяліць максімальную ўвагу паляпшэнню якасці законаў. Акрамя гэтага, Віктар Чайчыц мяркуе актыўна ўзаемадзейнічаць з дэпутатамі Саветаў усіх узроўняў і органамі мясцовага самакіравання, на якіх, па яго словах, ляжыць асноўная нагрузка па рабоце з насельніцтвам. Таму ён лічыць важнай задачай новых членаў верхняй палаты актыўна аказваць усялякую дапамогу і падтрымку, а не кантраляваць яе работу як вышэйшая інстанцыя. Віктар Чайчыц абяцаў асаблівую ўвагу ўдзяліць прававому выхаванню і прававой асвеце нашых грамадзян.

Яшчэ адзін кваліфікаваны юрыст — Сяргей СІВЕЦ, намеснік дырэктара — кіраўнік Інстытута прававых даследаванняў Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Беларусі. На яго погляд, на фоне новых выклікаў і праблем неабходна ўдасканальваць прававую сістэму, адэкватна і аператыўна рэагаваць на іх, у прыватнасці паляпшаць інвестыцыйны клімат у краіне.

Таццяна РУНЕЦ, начальнік галоўнага ўпраўлення Міністэрства фінансаў па Мінску, лічыць неабходным і надалей удасканальваць сістэму кіравання дзяржаўным фінансаваннем, а таксама інвестыцыйную палітыку. У сваёй праграме яна таксама адзначыла, што членам Савета Рэспублікі неабходна вывучаць грамадскую думку, а для гэтага рэгулярна сустракацца з працоўнымі калектывамі.

Алег РУМО — персона медыйная. Многія яго ў Беларусі ведаюць, як той казаў, у твар. Ён дырэктар Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, трансплантalогіі і гематалогіі, карыстаецца павышанай увагай сродкаў масавай інфармацыі. І Алегу Румо ёсць што расказаць аб дасягненнях сваіх калег. А цяпер у час пасяджэння Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў ён канстатаваў, што трансплантalогія стала сапраўды візітнай карткай, брэндам беларускай медыцыны. Алег Румо падзяліўся планамі на бліжэйшую перспектыву работы ў Савеце Рэспублікі, у прыватнасці паабяцаў усяляк садзейнічаць на заканадаўчым узроўні вырашэнню праблемы адтоку медыкаў за мяжу.

Яшчэ адзін славуты хірург будзе прадстаўляць сталіцу ў Савеце Рэспублікі. Гэта Канстанцін ДРАЗДОЎСКІ, дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра дзіцячай хірургіі. Яго плячэнікі кажуць, што ён — адзін са стваральнікаў беларускай дзіцячай кардыяхірургіі — выконвае аперацыі па карэкцыі найбольш складаных прыроджаных парокаў сэрца пераважна ў нованароджаных і дзяцей малодшага ўзросту. На яго погляд, медыцына мае патрэбу ў пастаянным удасканаленні. Канстанцін Драздоўскі назваў галоўныя шляхі гэтай работы: дэмаграфічная бяспека, кадравая палітыка ў дачыненні да кваліфікаваных спецыялістаў, аднаўленне даверу да сістэмы аховы здароўя, павышэнне яе іміджу за мяжой.

Ёсць усе надзеі спадзявацца на тое, што і прадстаўнікі акадэмічнай навукі краіны, рупліўцы вышэйшай і сярэдняй адукацыі зробяць істотны ўнёсак у дзейнасць верхняй палаты новага склікання. Гэта Андрэй ІВАНЕЦ, галоўны вучоны сакратар Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Гэта і Андрэй РУСАКОВІЧ, загадчык кафедры дыпламатычнай і консульскай службы факультэта міжнародных адносін БДУ. Гэта і Марына ІЛЬІНА, дырэктар гімназіі № 10.

**Старшыня Мінгарвыканкама Анатоль СІВАК** павіншаваў абраннікаў з новым статусам і выказаў упэўненасць у тым, што яны як вопытныя спецыялісты ў сваіх сферах будуць разам вырашаць складаныя задачы па сур'ёзным заканатворчым узроўні.

**Леанід ТУГАРЫН.**

РЭПАРЦЁР

# ПЕРШЫЯ БЮЛЕТЭНІ

**У Гомельскай вобласці на 17 мандатаў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу прэтэндуюць 75 чалавек. У першы дзень датэрміновага галасавання па выбарах дэпутатаў на ўчастку № 22, які знаходзіцца ў будынку Гомельскага абласнога Дома навучэнцаў і супрацоўнікаў прафесійнай адукацыі, усё падрыхтавана для выбаршчыкаў. Галасаваць сюды могуць прыйсці 1368 чалавек — менавіта столькі прозвішчаў значыцца ў спісах участковай камісіі.**

Перш за ўсё намеснік старшыні выбарчай камісіі Аляксандр Васіленка і сакратар Наталля Чыжова правяраюць скрыню для галасавання. Усё відавочна — яна тут празрыстая. Па ўсіх правілах на маіх вачах адбываецца працэс апячатвання. Адкрыта скрыня будзе толькі пасля заканчэння часу для галасавання — 17 лістапада ў 20 гадзін. На адведзеным месцы знаходзяцца наглядальнікі за выбарамі. Яны прадстаўляюць грамадскія аб'яднанні БРСМ і «Белая Русь».

Першы выбаршчык на ўчастак з'яўляецца ў 10.22. Гэта спартсмен Саша Чашчын, які займаецца грэка-рымскай барацьбой. Хлопец вучыцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры, а галасаваць прыехаў па месцы жыхарства ў Гомель. Юнак сціплы і не схільны да разважанняў. Да таго ж — вельмі спяшаецца.

Тым часам **старшыня ўчастковай выбарчай камісіі ўчастка для галасавання № 22 Ірына КУЗЬМІЦКАЯ** нагадвае калегам пра максімальную ўвагу да кожнага выбаршчыка. Тут дробязяў няма. Клапоціцца нават пра тое, каб чалавеку, які захоча піць, прапанавалі гарачы чай:

— У асноўны дзень выбараў галасаванне будзе адбывацца ў прасторным холе на другім паверсе будынка. А пакуль у асобным, выдзеленым для гэтай мэты пакоі. Пандус каля ўвахода ў будынак у нас ёсць. А вось лесвіца на другі паверх крутая. Таму будзе арганізавана работа валанцёраў, якія абавязкова акажуць садзейнічанне ўсім, хто не зможа самастойна трапіць на ўчастак. Таксама будзе адна шырокая кабіна — у яе чалавек з абмежаванымі магчымасцямі зможа заехаць без праблем і самастойна прагаласаваць. Для тых, хто дрэнна бачыць, падрыхтаваны спецыяльныя трафарэты. Калі нехта забыў акуляры — не бяда. У кожнай кабіне ёсць лупа. Мы ствараем усе ўмовы для таго, каб выбаршчыкам было зручна. Члены камісіі пры неабходнасці тлумачаць выбаршчыку неабходныя дзеянні, але ніколі не будуць раіць, за каго аддаць свой голас. Выбар чалавека павінен быць свядомым.



Першы выбаршчык на ўчастку № 22 у Гомелі — спартсмен Аляксандр ЧАШЧЫН.

Цяпер на ўчастку для галасавання, згодна з графікам, пастаянна дзяжураць па два чалавекі. На стэндзе інфармацыя пра кожнага з чатырох кандыдатаў у дэпутаты. Дарэчы, гэтая інфармацыя была надрукавана ва ўсіх СМІ, кандыдаты з выбаршчыкамі сустракаліся на пікетах і задавалі ім свае пытанні.

У чарговага выбаршчыка правяраюць дакументы, знаходзяць яго прозвішча ў спісе і аддаюць пад подпіс бюлетэнь для галасавання. Мужчына заходзіць у кабіну, і заўважыць яго далейшыя дзеянні проста немагчыма.

— Калі нехта з іншага месца захоча выканаць свой грамадзянскі абавязак на нашым участку, мы зробім званок па яго месцы жыхарства, удакладнім гэты факт і ўнясём яго ў спіс выбаршчыкаў, — заўважае Ірына Аляксееўна. — Спісы выбаршчыкаў напярэдадні правяраліся. Але ж бываюць выпадкі, калі чалавек ці прозвішча памяняў, ці пераехаў на іншае месца жыхарства. Калі гэта высвятляецца, мы ўносім яго ў дадатковы спіс.



Намеснік старшыні выбарчай камісіі ўчастка для галасавання № 22 Аляксандр ВАСІЛЕНКА і сакратар Наталля ЧЫЖОВА.

У выбаршчыка Паўла Комара такіх праблем няма. З ім гаворым пра тое, якія якасці павінен мець сапраўдны народны абраннік:

— Важна, каб чалавек дакладна бачыў мэту, дзеля якой ён ідзе абірацца дэпутатам Палаты прадстаўнікоў. Важна, якая матывацыя ў чалавека: амбіцыі ці жаданне паслужыць людзям. Сёння трэба вырашаць праблемы сацыяльнай накіраванасці. Напрыклад, у новабудоўлях не хапае дзецям месцаў у садках і школах. Стан дарожнага пакрыц-

# АБІРАЮЦЬ САМЫХ

**Напярэдадні выбараў мы задалі самым розным людзям адно і тое ж пытанне: «Якімі якасцямі, на вашу думку, павінен валодаць дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі?» Вось што нам адказалі.**

## Прафесіяналы і крэатыўшчыкі

**Акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук, дэпутат Палаты прадстаўнікоў чацвёртага склікання Мікалай КАЗАК** лічыць, што адна з галоўных якасцяў, якой павінен валодаць парламентарый, — высокі прафесіяналізм на тым месцы работы, дзе працуе кандыдат у дэпутаты. «Бо дзейнасць парламента вельмі разнастайная, закранае ўсе сферы нашага грамадства, эканоміку, — тлумачыць ён свой пункт погляду. — Трэба, каб законы прымалі прафесіяналы сваёй справы. Каб законы прымаліся зыходзячы з ведання рэчаіснасці, каб яны працавалі, а не заставаліся толькі на паперы. Але разам з тым гэтыя прафесіяналы павінны валодаць шырокай кампетэнцыяй і ў іншых сферах. Бо работа над законам вымушае арыентавацца ў сумежных галінах. Не бывае закона, які закранае толькі адзін бок. Гэта, на мой погляд, самае галоўнае».

Апроч заканатворчай дзейнасці, дэпутат працуе з выбаршчыкамі. Гэта азначае, што ён бярэ на сябе адказнасць за жыхароў акругі, якія аддалі за яго свае галасы. «Па сваім вопыце памятаю, што прыходзяць людзі з самымі разнастайнымі пытаннямі, — кажа Мікалай Казак. — Жыллё, рамонты, будаўніцтва, аказанне дапамогі... І асабістымі пытаннямі выбаршчыкаў часам даводзіцца займацца. Таму трэба быць добрым да людзей. Гэта таксама вельмі важна. Трэба старацца ўнікнуць у іх патрэбы, зразумець, чаго яны хочуць. Я заўсёды кіруюся прынцыпам: хочаш прыняць правільнае рашэнне — пастаў сябе на месца таго, хто цябе пра нешта просіць. Тады становіцца зразумела, як гэта пытанне трэба вырашаць».

Акадэмік заўважае, што ў Беларусі няшмат прыродных багаццяў, таму адзінае, што можа забяспечыць росквіт краіны, — інавацыі. «Я ў свой час працаваў над Законам аб дзяржаўнай інавацыйнай палітыцы. Цяпер наведваю Кітайскую Народную Рэспубліку і бачу, што Кітай удзяляе вельмі вялікую ўвагу развіццю інавацый. Гэта вельмі важны кірунак, які мы ў нашай краіне, магчыма, яшчэ недастаткова развіваем. Таму кожны дэпутат павінен быць інаватарам, крэатыўным чалавекам, павінен умець выказваць незвычайныя, але жыццёвыя ідэі і прымаць рашэнні па іх рэалізацыі», — дадае Мікалай Казак.

На пытанне журналіста «МС», ці дастаткова ў дэпутата паўнамоцтваў, каб рэалізоўваць такія ідэі, вырашаць праблемы выбаршчыкаў, вучоны адказаў: «Канешне. Проста трэба быць больш упэўненым у сабе. Нейкі час для дэпутата, які абраны ўпершыню, сыходзіць на тое, каб асвоіцца. Але калі пачынаеш разумець усю адказнасць, то і адносішся больш патрабавальна не толькі да сябе, але і да іншых. Пры абмеркаванні законаў можна ставіць пытанні, падымаць і вырашаць праблемы, удасканальваць законы», — упэўнены акадэмік.

Той жа Закон аб інавацыйнай палітыцы прыйшоў у парламент (распрацоўшчыкам быў Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях) вельмі куцым, згадвае Мікалай Казак. «Чаму? Бо пры ўзгадненні многія міністэрствы яго проста выпусташылі, — тлумачыць ён. — Па ўзгадненні з Адміністрацыяй Прэзідэнта нам удалося яго істотна перарабіць. Гэта была заслуга Пастаяннай камісіі, у якой я працаваў, дэпутатаў і апарату парламента, Галоўнага прававога ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта. Многія пытанні, якіх раней не было ў заканадаўстве, удалося адлюстраваць, напрыклад дзяржаўна-прыватнае партнёрства, венчурнае фінансаванне...

Іншымі словамі, дэпутаты не павінны ўспрымаць як данасць дакументы, якія паступаюць у парламент. Рэч у тым, што міністэрствы і ведамствы часам спрабуюць выключыць з праектаў законаў рэчы, якія могуць ускладніць іх жыццё. Дэпутат жа павінен кіравацца інтарэсамі краіны, эканомікі, грамадства, а не местачковай карысцю», рэзюмуе вучоны.

## Тыя, каму ёсць што сказаць

**Мастак, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, прафесар Віктар АЛЬШЭЎСКІ** упэўнены, што чалавек, які вырашыў абрацца ў беларускі парламент, павінен асэнсоўваць значнасць сваёй дзейнасці там. «Гэта высокі дзяржаўны статус, у якім чалавек можа праявіць усе свае найлепшыя прыродныя якасці, вопыт, якога ён дасягнуў на момант абрання. Гэта павінен быць чалавек, якому ёсць што сказаць, які здольны глыбока разумець, што значыць дзяржаўнасць, які імкнецца ўвесь час самаўдасканальвацца, расці», — тлумачыць мастак сваю пазіцыю.

— Што да заканадаўства ў сферы сельскай гаспадаркі, я не сказала б, што на ферме цяпер такія ўжо цяжкія ўмовы, як раней. Ужо крыху лягчэй: усё ж такі ўвялі гэтыя малакаправоды, не тое, што рукамі даілі, у вёдры. Лічу, дастаткова ўвагі ўдзяляецца на ўзроўні дзяржавы, спрасцілі трошкі ўмовы працы.

Як жанчына, шматдзетная маці, лічу, што ў нас падтрымліваюць жанчын з вялікай сям'ёй. Але бадай што крыху і малавата. Цяжкавата трохі ім з дзецьмі... Я разумею па сабе (у Аляксандры Адольфаўны дзесяць дзяцей. — **«МС»**), але тады і працавала, нейкую і «дзіцячую» атрымлівала дапамогу. Гэта прасцей, а ім зараз досыць складана. Сёння адны «дзіцячыя», альбо пасля трох гадоў ідзе адна толькі зарплата, а «дзіцячых» няма.

Зразумела, глядзіць закон: камусьці належыць, а камусьці і не належыць. Нехта будзе прапіваць — дык гэта ж таксама не справа. Дык так і раней было: хтосьці працаваў і «дзіцячыя» толькі на дзяцей траціў, а хтосьці толькі на сябе, на сваё задавальненне.

Самой не даводзілася звяртацца да дэпутатаў. Нічога не прасіла ні ў кога. Арыентуюся на свае сілы, і ўсё. Не чакаю ні ад кога падтрымкі — калі мне трэба, я сама.

Я ведаю, хто ў нас вылучае сваю кандыдатуру, знаёма асабіста, і згодна з ёю. Думаю, увесь давер апраўдае. Калі людзі выберуць яе, будзе за людзей стаяць.

## Прыстойныя

**Галоўны трэнер мужчынскай нацыянальнай каманды па цяжкай атлетыцы Віктар ШАРШУКОЎ:**

— Мяркую, дэпутат павінен валодаць усімі нармальнымі якасцямі чалавека. Гэта, па-першае, мусіць быць прафесіянал, па-другое — прыстойны чалавек. Галоўнае, каб быў карысны ў якасці дэпутата, а сямейны ці працоўны статус не настолькі важныя.

Так, людзі могуць па тых ці іншых прычынах на сённяшні дзень не працаваць, але ў іх можа быць багатая гісторыя, і яны таксама пэўную частку нашай грамадскасці павінны прадстаўляць і абараняць.

Калі будзе шматпалярнасць, будзе як мага больш слаёў нашай грамадскасці прадстаўлена, гэта толькі лепш. Усё павінна быць збалансавана. Увогуле хацелася б, каб у парламенце былі прадстаўлены ўсе ўзросты: і моладзь, і больш сталыя людзі.

Для спорту ў нашай краіне робіцца вельмі шмат. Але спорт найвышэйшых дасягненняў — гэта вельмі тонкая сфера, і хацелася б большай далікатнасці, меншай жорсткасці.

У нас сёння прыняты самыя жорсткія законы ў свеце для трэнераў. Хацелася б, каб тут не была перагнута палка, таму што, на жаль, я ведаю, што сёння адток трэнераў — велізарны. Адной жорсткасцю не навесці парадак, напрыклад, у допінгу. Тут трэба яшчэ дапрацаваць, таму што шмат хто пасля гэтых сілавых законаў проста пакінуў спорт. І ў нас па статыстыцы цяпер (у цяжкай атлетыцы, прынамсі) шмат хто перайшоў у іншыя сферы ці ў школы.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,**
**Варвара МАРОЗАВА,**
**Марыя ДАДАЛКА.**



РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# АД ШАМПІНЬЁНАЎ ДА РЫКОТЫ

## Як у Шчучынскім раёне спрыяюць развіццю малога і сярэдняга бізнесу

**У гэтым упэўніліся дэпутаты Гродзенскага абласнога Савета падчас выязной 17-й сесіі. Яны пабывалі на некалькіх прыватных прадпрыемствах, якія выпускаюць новую прадукцыю і робяць значны ўнёсак у гарадскі бюджэт.**



Пра тое, што раён сапраўды добра працуе ў гэтым кірунку, сведчыць такі факт. Сёлета Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва прызнала Шчучынскі раён найлепшым для вядзення бізнесу сярод раёнаў з насельніцтвам менш за 50 тысяч чалавек. Эканамічная актыўнасць відавочная. Калі ў 2005 годзе тут было толькі тры прыватныя прадпрыемствы, то цяпер іх больш за дзвесце. Як падкрэсліў **старшыня райвыканкама Аляксей САДОЎСКІ**, выканаўчая ўлада сумесна з дэпутатамі працуе на прыватнага інвестара. А гэта — нізкі кошт зямельных участкаў, добрыя экалагічныя ўмовы і стан дарог, ільготныя падаткі, шырокі выбар аб'ектаў былых вайсковых часцей.

Адзін з апошніх праектаў — фабрыка па вытворчасці шампіньёнаў. Яна пабудавана на месцы былога вайсковага аэрадрома на ўчастку СЭЗ «Гроднаінвест». Літаральна за два гады тут выраслі два комплексы, адзін з якіх ужо год паспяхова працуе, а другі ўведзены з апярэджаннем графіка літаральна днямі. Гэта першая «грыбная» фабрыка ў Гродзенскай вобласці такога ўзроўню. За год тут атрымалі амаль 2,5 тысячы тон свежых грыбоў, паведаміў **тэхнолаг прадпрыемства «Логал-Біа» Канстанцін КУЦ**.

Па яго словах, прадукцыя паспяхова рэалізуецца на ўнутраным і знешнім рынку. З пускам новага комплексу магутнасць павялічыцца ўдвая. Не прападае і грунт. Цяпер ён ідзе для падкормкі раслін, але мясцовы фермер мае намер рабіць з яго канцэнтрат і выкарыстоўваць нанова. Гэта значыць, што ў хуткім часе ў Шчучыне з'явіцца яшчэ адна прыватная вытворчасць.

Калі «грыбны» завод — найбуйнейшы ў Гродзенскай вобласці, то завод «Праймілк» па выпуску малочна-тлушчавага канцэнтрату — самы маштабны падобны праект не толькі ў Беларусі, але і ў краінах Усходняй Еўропы. Ён існуе тры гады, і за гэты час пашырыў асартымент, рынкі збыту і абзавёўся сапраўднай камандай аднадумцаў. Мікраклімат накіраваны на здаровы лад жыцця.

— У нас на прадпрыемстве поўнасцю забаронена курэнне, бо гэта займае працаўніц адрэзак часу — 40 хвілін, калі ўлічваць санітарныя нормы, — адзначыў **дырэктар Анатоль БЯЛЯЎСКІ**. — А выпадкі курэння непасрэдна ў вытворчых карпусах былі жорстка спынены — з усіх, незалежна ад таго, курыў работнік ці не, было знята 50 % надбаўкі да зарплаты. Некаторыя нават увогуле курыць кінулі. Забаронены і мабільныя тэлефоны, гэта сусветная практыка, ёсць кнопачныя спецыяльныя тэлефоны для сувязі. Затое кожны мае медыцынскую страхоўку. Цякучасці кадраў няма, наадварот, у аддзеле кадраў ляжыць больш за тысячу анкет, у тым ліку маладых спецыялістаў. Перш чым прыняць на работу, суіскальнік праходзіць стажыроўку тры месяцы.

Прадпрыемства пашырае лінейку прадукцыі. Цяпер тут асвоілі выпуск інгрэдыентаў на аснове малочнай сыроваткі, а наліта плануюць выпускаць сыр рыкота на італьянскім абсталяванні — 30 тон у суткі. Як паведаміў **галоўны тэхнолаг Павел ЮРЭВІЧ**, шчучынская рыкота будзе не толькі традыцыйна тварожнага выгляду, але і ў зернях. Спажывец атрымае новую прадукцыю ў шклянках па 250 альбо 400 грамаў, а таксама для аптовых партнёраў — у вёдрах і мяшках.

Поспехі прадпрыемства станоўча адбіваюцца і на эканоміцы раёна. Растуць паступленні ў бюджэт. Напрыклад, завод сёлета заплаціў падаткаў на мільён 700 тысяч долараў у эквіваленце, з іх амаль палова трапіла ў бюджэт раёна. З гэтага года ў раённы бюджэт пачалася выплата падатку на нерухомасць у суме, эквівалентнай 61 тысячы долараў штомесяц.

У раёне будзе ў найбліжэйшы час рэалізавана яшчэ некалькі буйных бізнес-праектаў. Адзін з іх — сумесная беларуска-турэцкая вытворчасць бялковых дабавак. З Польшчай і Ізраілем ёсць планы стварыць сумесныя прадпрыемствы па вытворчасці піламатэрыялаў і дрэваапрацоўцы.

— Менавіта малы і сярэдні бізнес — гэта рухавік любой эканамічнай сістэмы. У многіх еўрапейскіх краінах ён складае асноўную частку валавога прадукту. У Беларусі, у тым ліку ў Гродзенскай вобласці, таксама робіцца акцэнт на развіццё прыватнай ініцыятывы. Але людзей трэба «разняволіць». І ў гэтым важная роля дэпутатаў. Заканадаўцам трэба звярнуць увагу на гэты сектар эканомікі, у першую чаргу на падаткаабкладанне, яго даступнасць для вядзення бізнесу, — адзначыў **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар ЖУК.**

Для таго каб гэты сектар развіваўся, працуе і дэпутацкі корпус. Напрыклад, у абласным Савеце цяпер 10 % — гэта дэпутаты-прадпрымальнікі, якія ведаюць праблемы знутры і садзейнічаюць іх вырашэнню. На актывізацыю дэпутацкага корпуса ў пытаннях спрыяльнага бізнес-клімату звярнуў увагу памочнік Прэзідэнта — **інспектар па Гродзенскай вобласці Іван ЛАЎРЫНОВІЧ**. Ён падкрэсліў, што неабходна вылучыць пункты росту кожнага раёна, якія будуць дапамагаць руху «лакаматыва» рэгіёна.

— У нас шмат рэзерваў у аграрным сектары, таму трэба больш укладваць у сяло, развіваць аграбізнес, спрыяць уласным інвестыцыям. Калі чалавек будзе укладваць свае сродкі ў прадпрымальніцкую дзейнасць, ён будзе трымацца за яе, яму не будзе сэнсу з'язджаць, шукаць нейкі іншы заробак, і дэпутаты павінны працаваць у гэтым кірунку, — заўважыў Іван Лаўрыновіч. — Нам важна выпрацаваць уласную формулу для жыцця, каб усім было камфортна, бо наша галоўнае багацце і патэнцыял — гэта нашы людзі і зямля.

Што датычыцца мадэлі, то ў Шчучыне яе бачаць у прыцягненні інвестыцый. Як было адзначана падчас сесіі спецыялістамі раёна, тут захавалася проста безліч аб'ектаў былых ваенных гарадкоў і баз, якія паступова атрымліваюць другое жыццё. Шмат створана вытворчых прадпрыемстваў, крам, майстэрняў, аб'ектаў «бытоўкі», грамадскага харчавання, складскіх памяшканняў. Адпрацаваны механізм продажу за адну базавую велічыню. Нядаўна на Шчучынскім аэрадроме нават адкрылі прыватны музей часоў «халоднай вайны», адзіны такога кшталту ў Беларусі. Ён размяшчаецца ў былым сакрэтным бункеры пад зямлёй і выклікае вялікі інтарэс беларускіх і замежных турыстаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

КРОКІ ДА ЭКАЛОГІІ

# РУХАЦЦА Ў ПРАВІЛЬНЫМ КІРУНКУ

## Як паўдзельнічалі гарады ў сёлетнім Еўрапейскім тыдні мабільнасці?

**На працягу сямі дзён жыхары сотняў гарадоў з 45 краін Еўропы, у тым ліку і 76 беларускіх гарадоў, дэманстравалі альтэрнатыўныя аўтамабілю спосабы і сродкі перамяшчэння ў гарадскім асяроддзі. Сярод найлепшых быў названы пасёлак Лагішын Пінскага раёна.**

— У пасёлку панавала асаблівая атмасфера. Нас, яго жыхароў, перапаўнялі гонар і пачуццё адказнасці за дачыненне да важнай міжнароднай справы. Сярод лагішынцаў абыякавых да ідэі тыдня не было. Амаль усе жыхары ў той ці іншай ступені імкнуліся паўдзельнічаць у яго мерапрыемствах, — паведаміла **Ірына ПЕТРУКОВІЧ, кіраўнік спраў Лагішынскага сельскага Савета** ў час сваёй прэзентацыі на канферэнцыі, прысвечанай вынікам Еўрапейскага тыдня мабільнасці (ЕТМ) — 2019.

У сувязі з гэтым цікава прасачыць штогадовую дынаміку ўдзелу Беларусі ў тыдні мабільнасці. Наша краіна адносна нядаўна далучылася да яго. Нагадаем, у 2015 годзе ў ЕТМ удзельнічалі толькі Мінск, Полацк і Наваполацк, у 2016-м ужо 19 гарадоў, у 2017-м — 46 гарадоў і населеных пунктаў, у 2018-м — 66. Далучаліся ў пераважнай большасці абласныя і раённыя цэнтры, гарады абласнога падпарадкавання.

А гарадскі пасёлак Лагішын з насельніцтвам прыкладна 2200 чалавек нароўні з куды большымі гарадамі яскрава і крэатыўна ўдзельнічае ў Еўрапейскім тыдні мабільнасці. У сэнсе прыцягнення невялікіх населеных пунктаў да глабальных экалагічных акцый і маштабных кампаній досвед Лагішынскага сельсавета і прывабны, і варты вывучэння і пераймання. Гэта тым больш актуальна на фоне шэрагу гарадоў з куды большымі магчымасцямі і насельніцтвам, якія фармальна далучыліся да кампаніі, падпісалі паперы, а па сутнасці нічога істотнага не зрабілі для папулярызацыі альтэрнатыўнага аўтамабілю руху на гарадскіх дарогах.

Сёлета тэма тыдня мабільнасці ў Лагішыне была прысвечана, як і ўсюды ў краіне, прыцягненню ўвагі і засваенню мясцовым насельніцтвам бяспечных пешых і веласіпедных маршрутаў.

— У рамках тыдня мабільнасці быў праведзены шэраг загадзя прадуманых і спланаваных разам з райсаветам мерапрыемстваў. У гэтым нам вельмі дапамаглі супрацоўнікі аддзелаў і арганізацый райвыканкама. Мы імкнуліся сумесна падрыхтаваць цікавую і разнастайную праграму. Яна, па водгуках жыхароў пасёлка, атрымалася. На працягу тыдня праводзіліся мэтавыя мерапрыемствы. Гэта экалагічная квэст-гульня «Зялёная планета», майстар-клас, конкурс знаўцаў правіл дарожнага руху на тэму «Веласіпед і дарога». Завяршыўся тыдзень мабільнасці велапрабегам, — расказвае **старшыня сельсавета Валерый ШУШКО.**

У той дзень сапраўдныя прыхільнікі здаровага спосабу жыцця Лагішына сабраліся каля мясцовай АЗС. Сярод іх былі заўважаны, у прыватнасці, намеснік старшыні райвыканкама Дзмітрый Палхоўскі, старшыня сельсавета Валерый Шушко, работнікі ААТ «Лагішын», навучэнцы і дырэктар Лагішынскай сярэдняй школы Сяргей Норбут і іншыя. Усяго ў велапрабегу ўдзельнічалі 15 прадпрыемстваў і арганізацый пасёлка. Самай шматлікай аказалася каманда школы, якую прадстаўлялі і педагогі, і тэхнічныя работнікі, і навучэнцы. Веласіпедысты праехалі па вуліцах Леніна, Дзяржынскага, Свярдлова, Сацыялістычнай і фінішавалі каля маладзёжнага цэнтра культуры. Яго супрацоўнікі, дарэчы, у падтрымку ідэй мабільнасці правялі флэшмоб «Мабільнасць і актыўнасць, здароўе, крэатыўнасць» пад дэвізам «Выбірай і рухайся!»

Гэта толькі на першы погляд здаецца, што проста пераканаць заўзятага аўтамабіліста кінуць любімага «жалезнага каня» і перасесці на веласіпед. Паводле слоў **начальніка аддзела арганізацыі дарожнага руху і дарожнай інспекцыі УДАІ МУС Беларусі Дзмітрыя НАВОЯ**, сёння веласіпедыстам нярэдка даводзіцца сутыкацца з праявамі так званага шавінізму кіроўцаў. Ёсць сярод іх агрэсіўная меншасць, якая з прычыны недасведчанасці ці прабелаў у адукацыі і выхаванні не ўспрымае актуальнасці стварэння ўстойлівай гарадской мабільнасці. Іх трэба пераконваць і пераконваць.

Тут неабходна падкрэсліць, што на самым пачатку, калі лагішынская мясцовая ўлада вагалася наконт далучэння да Еўрапейскага тыдня мабільнасці, яе падтрымаў Іван Рабкавец, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Ён прапанаваў: давайце паспрабуем. Першы блін не быў камяком. І ўжо трэці год запар Лагішын становіцца актыўным і паспяховым удзельнікам ЕТМ.

— У раёне гэта новая практыка работы сельскага Савета. У яго дэпутатаў увогуле шмат чаго з задуманага атрымоўваецца. Чаму? Умеюць знайсці падыход да людзей. Дзякуючы намаганням сельсавета пасёлак прыгожы, утульны, з добрай інфраструктурай, амаль усе дарогі заасфальтаваны. Не сорамна гасцям паказаць. Між іншым, першымі ў раёне высаджваць кветкі на вуліцах пачалі менавіта ў Лагішыне. Ёсць тут дзе адпачыць у вольны час моладзі. Дом міласэрнасці — прадмет асаблівага клопату і гонару дэпутатаў, — расказвае **старшыня Пінскага раённага Савета дэпутатаў Іосіф ГУЗІЧ.**

На яго думку, пасёлак развіваецца ў правільным кірунку. І, відаць, недарэмна Лагішын разглядаецца цяпер у якасці кандыдата на месца правядзення абласных дажынак у 2021 годзе. Даверадь — сельсавет абавязкова справіцца.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

# 1:12

# Такія суадносіны колькасці беспрацоўных і колькасці прапаноў работы на Міншчыне. А як у іншых рэгіёнах?

**Сітуацыя на рынку працы ў краіне стабільная, а колькасць занятых у эканоміцы застаецца практычна нязменнай. У агульнарэспубліканскім банку вакансій даступна звыш 80 тысяч прапаноў, большасць з якіх рабочыя спецыяльнасці. Пра гэтыя і іншыя акалічнасці пошуку работы расказалі спецыялісты.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

## Навучанне пад заказ і самастойны пошук

За 2019-ы ў службу занятасці звярнулася больш за 140 тысяч чалавек, з якіх больш чым сотні тысяч аказана садзейнічанне па працаўладкаванні. Сёлета ў краіне адзначаецца ажыўленне з боку прапаноў рабочай сілы, а таксама расце колькасць вакансій і попыт на рабочую сілу, паведаміла **Алёна ДАКУКІНА, намеснік начальніка ўпраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі:**

*— Важны аспект у рабоце службы занятасці — найхутчэйшае вяртанне беспрацоўнага на рынак працы. Каб чалавек, які страціў работу, хутчэй яе знайшоў. Грамадзяне таксама актыўна шукаюць работу самастойна, часцей за ўсё праз інтэрнэт. Расце колькасць зваротаў і да агульнарэспубліканскага банка вакансій, які за дзевяць месяцаў наведалі больш за 12 мільёнаў разоў. Сёлета тэмп росту колькасці занятых склаў 99,8 %, і гэты ўзровень стабільны цягам усяго названага перыяду.*

У апошнія гады служба занятасці перагледзела падыходы да маніторынгу рынку працы. Новым крокам стала вызначэнне пераліку тэрыторый з напружанай сітуацыяй у сферы працаўладкавання — дэпрэсіўных раёнаў. Сёлета гэта 53 тэрыторыі, большасць з якіх (па 15) знаходзіцца ў Віцебскай і Магілёўскай абласцях. Пры гэтым амаль 80 % тэрыторый з пераліку цягам года палепшылі сітуацыю.

У краіне праводзіцца работа па развіцці і падтрымцы высокай матывацыі грамадзян да актыўнага пошуку работы, адзначыла Алёна Дакукіна:

*— Улічваюцца індывідуальныя асаблівасці, тэрытарыяльны разрэз, аналізуецца інфармацыя, хто патрэбны. Асноўны акцэнт робіцца на патрэбах наймальніка. Арыентуюцца не проста на навучанне беспрацоўных, а на навучанне пад заказ (такіх больш за 60 % ад усіх, хто перавучваецца), што гарантуе стапрацэнтнае працаўладкаванне. Сёлета больш за 4000 беспрацоўных накіравана на навучанне. Гэта каля 5 % ад усіх, хто мае патрэбу ў рабоце. Хацелася б большай актыўнасці з боку саміх беспрацоўных, бо наймальнік патрабуе нашмат большага ўзроўню кваліфікацыі людзей, чым той, якім яны валодаюць цяпер.*

Беспрацоўныя могуць прайсці навучанне больш чым па 100 прафесіях. Каля дзесяці з іх інтэграваныя: калі адначасова людзі атрымліваюць дзве і больш спецыяльнасці, у асноўным па рабочых прафесіях — напрыклад, тынкоўшчык-маляр ці абліцоўшчык-плітачнік. Тыя, хто не працаўладкаваўся пасля першага навучання, маюць права зноў звярнуцца ў службу занятасці, і больш за 90 % з іх ужо знаходзіць работу.

## 20 тысяч вакансій для сталіцы

У Мінску пастаянна расце попыт на рабочую сілу. Сёлета штомесяц прапаноўваецца каля 20 тысяч вакансій. Сярод запатрабаваных — машыністы электрацягнікоў, прадаўцы, кантралёры, касіры, повары, кандытары і іншыя. 77 % тых, хто працуе ў сталіцы, занятыя ў эканоміцы, і іх доля павялічваецца.

Служба занятасці пастаянна праводзіць мерапрыемствы, скіраваныя на садзейнічанне занятасці грамадзян. Міні-кірмашы вакансій (штотыднёва), два разы на год агульнагарадскія кірмашы, дні прадпрыемстваў, выязныя кірмашы на саміх прадпрыемствах.

*— Важна расказаць чалавеку пра рабочае месца і прафесію, якая заяўляецца наймальнікам. Рэалізуюцца і новыя формы, напрыклад электронныя кірмашы вакансій, у якіх паўдзельнічала ўжо больш за 50 наймальнікаў. І за гэтай формай работы будучыня,* — лічыць **Таццяна КУДЗЕВІЧ, намеснік старшыні камітэта — начальнік упраўлення занятасці насельніцтва камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама.** — *Мы праводзім таксама адрасныя мерапрыемствы для мэтавых груп: людзей, якія маюць абмежаванні па стане здароўя; грамадзян, якія выйшлі з месцаў зняволення або лячэбна-працоўных прафілакторыяў. У межах гэтых сустрэч мы праводзім кансультацыі і арыентуем людзей на працаўладкаванне.*

Многія беспрацоўныя досыць прадпрымальныя, і ім прапануюць рэалізаваць сябе ў самазанятасці. Больш за 90 чалавек арганізавалі такім чынам уласную справу. Сфарміраваны банк часовых, сезонных работ, якія таксама прапануюць людзям. Больш чым тысяча чалавек паўдзельнічала ў аплатных грамадскіх работах. І гэта магчымасць атрымаць прыбытак, пакуль не знойдзецца пастаянная работа. Усе паслугі, якія прапануюцца грамадзянам сацслужбай, бясплатныя, запэўніла Таццяна Кудзевіч:

*— Грамадзянам, якія маюць абмежаванні па стане здароўя і працоўныя рэкамендацыі (інваліды II, III групы), а такіх больш за 8000, мы накіроўваем запрашэнні ў нашу службу. Згодна з праграмай працоўнай адаптацыі мы стымулюем наймальнікаў, і да іх прыходзяць гэтыя грамадзяне, якія цягам года адаптуюцца. Яны атрымліваюць магчымасць набыць працоўныя навыкі на рабочым месцы. Гэта важна, бо чалавек адаптуецца і прыходзіць на пастаянную работу ўжо падрыхтаваным.*

## Перасяленне і субсідыі на сваю справу

Сітуацыя на рынку працы Мінскай вобласці таксама характарызуецца павелічэннем колькасці рабочых месцаў. Узровень беспрацоўя тут 0,2 %, што менш, чым у іншых рэгіёнах.

*— У вобласці працуе 686 тысяч чалавек. Гэта амаль стапрацэнтны ўзровень занятасці,* — адзначыла **Наталля ІГНАТОВІЧ, намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама.** — *Актыўна шукаюць работу ў малым бізнесе і самазанятасці. На развіццё ўласнай справы ў вобласці сёлета атрымалі субсідыі (11 бюджэтаў пражытачнага мінімуму ў горадзе, 13 — на сяле) 219 чалавек. Індывідуальныя прадпрымальнікі рэгіструюцца ў сферах паслуг, напрыклад у галінах цырульніцтва, бытавога абслугоўвання, вытворчасці, паслуг СТА.*

Не кожны чалавек можа знайсці работу па месцы жыхарства, таму службы занятасці прапануюць грамадзянам такі варыянт, як перасяленне. Сацслужба пры гэтым супрацоўнічае з наймальнікам з іншага раёна, складае трохбаковы дагавор, і чалавек з сям'ёй пераязджае ў іншы рэгіён, дзе яму даюцца работа і жыллё. Сёлета такім чынам пераехалі ўжо 35 сем'яў.

Актыўна ў вобласці працуюць з людзьмі, якія не могуць працаўладкавацца на агульных падставах: інвалідамі, асобамі, якія вярнуліся з турмаў; матулямі, што выйшлі з дэкрэту.

*— У межах адаптацыі інвалідаў II, III групы наймальнікам кампенсуюць частку заработнай платы такіх работнікаў. Гэта адзін з матывуючых фактараў для работадаўца, і многія ў гэтым зацікаўлены,* — дадала Наталля Ігнатовіч. — *Яшчэ адзін кірунак працаўладкавання — стварэнне новых рабочых месцаў, як правіла, высокатэхналагічных. Запланавана стварыць сем тысяч такіх месцаў. Сярод наймальнікаў па вобласці гэта Geely у Барысаўскім раёне, 57 месцаў створана кампаніяй «Юніміт» у Смалявіцкім раёне, 31 — кампаніяй «Інтэртрансаўта» ў Дзяржынскім.*

Патрэба ў кадрах у Мінскай вобласці сёлета звыш 18 тысяч вакансій, летась іх было 14 тысяч. На аднаго беспрацоўнага ўмоўна прыпадае па 12 прапаноў работы. Запатрабаваны жывёлаводы, заатэхнікі, ветэрынары, урачы, медсёстры.

**Ірына СІДАРОК.**

**ЗАО «Евробанк» извещает о проведении седьмых повторных торгов в электронной форме в виде открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ликвидируемому закрытому акционерному обществу «Евробанк» (далее – электронные торги).**

Продавец – ЗАО «Евробанк».
**Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке «Единая система электронных торгов» – torgi.gov.by.**
**Продолжительность электронных торгов – 30 календарных дней (с 18.11.2019 г. по 17.12.2019 г.)**
СВЕДЕНИЯ ОБ ИМУЩЕСТВЕ, ВЫСТАВЛЯЕМОМ НА ЭЛЕКТРОННЫЕ ТОРГИ:

| № лота | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС | Шаг торгов (5 %), бел. руб. | Сумма задатка (5 %), бел. руб. | Преимущества |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Капитальное строение с инв. № 500/С-35055, общая площадь 1432 кв. м, 4 этажа, расположенное на земельном участке площадью 0,1235 га с кад. ном. 500000000007006447, который находится на праве аренды по 31.01.2023 г., по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 129/5 | 1 174 706,04 | 58 735,30 | 58 735,30 | – пригодно для размещения банков и финансовых организаций;<br>– установлены дополнительные системы защиты от взлома;<br>– внутренняя и внешняя отделка здания;<br>– имеются все инженерные коммуникации;<br>– система кондиционирования;<br>– оборудованы офисные помещения;<br>– расположено в торговом комплексе «Ждановичи»;<br>– отличное транспортное сообщение;<br>– 630 м от МКАД;<br>– охраняемая территория с видеонаблюдением;<br>– парковочные места на территории. |
| Лот № 2 | Сеть волоконно-оптических кабелей (волоконно-оптический кабель на объекте ТРЦ «Град» и волоконно-оптическая линия на участке: помещение АТС (г. Минск, ул. Тимирязева 125/8) – серверная РКЦ-2 (г. Минск, ул. Тимирязева, 123/4)) | 8 760,00 | 438,00 | 438,00 | – высокая скорость передачи информации (от 1 до 10 Гбит/с на расстоянии 1 км);<br>– небольшие габаритные размеры и масса кабелей;<br>– высокая помехозащищенность волоконно-оптических кабелей |

***Подробную информацию о реализуемом имуществе ЗАО «Евробанк», включая фотографии, можно получить на сайте: http://www. torgi.gov.by.***
Также с имуществом, выставляемым на электронные торги, можно ознакомиться по месту его нахождения, предварительно согласовав время по тел. +375 29 141 01 01 (ликвидатор ЗАО «Евробанк» Хвостович Сергей Валерьевич).
Для участия в электронных торгах по Лотам №№ 1–2 в период с 18 ноября 2019 года по 17 декабря 2019 года необходимо **зарегистрироваться на электронной торговой площадке «Единая система электронных торгов» – torgi.gov.by** и **сделать ставку** (при условии наличия на счете участника торгов, открытом на электронной площадке, достаточной суммы средств для внесения задатка) в размере 5 % от начальной цены имущества.
Сумма шага аукциона по каждому лоту составляет 5 % от начальной цены предмета аукциона.
Электронные торги проводятся в соответствии с Постановлением Советом Министров от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица».
Победителем электронных торгов является лицо, предложившее наибольшую цену.
Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов производится победителем электронных торгов по фактическим затратам.
В случае если электронные торги признаны несостоявшимися, в силу того, что ставка сделана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.
По результатам электронных торгов составляется протокол в двух экземплярах.
Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 дней с даты проведения электронных торгов.
Срок оплаты предмета торгов – 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.
Подробную информацию о порядке, условиях проведения электронных торгов, предмете торгов можно получить по тел. +37529 308 38 37 (Алена Александровна).
УНП 807000148

ОРША: ПЕРАЗАГРУЗКА

# Прамысловае прыцягненне

## У Оршы пачаў працаваць першы ў краіне завод па вытворчасці стальных бясшвовых балонаў

**Прамысловы сектар Аршаншчыны папоўніўся новым унікальным прадпрыемствам. На плошчах ААТ «Завод «Легмаш» запрацаваў першы ў Беларусі завод па вытворчасці стальных бясшвовых балонаў ТАА «Цыліндэрс-Бел», паведамляюць «Віцебскія весткі».**



vitvesti.by

У яго стварэнне інвеставана больш за 5 мільёнаў еўра. Выйсці на праектныя магутнасці са штогадовым аб'ёмам вытворчасці балонаў больш чым у 53 тысячы балонаў прадпрыемства мае намер у 2022 годзе.

ТАА «Цыліндэрс-Бел» спецыялізуецца на вытворчасці балонаў аб'ёмам ад 10 да 100 літраў і ціскам 200—450 бар, прызначаных для транспарціроўкі і захоўвання сціснутых, звадкаваных і раствораных тэхнічных газаў, якія ўжываюцца ў розных галінах. Ільвіную долю прадукцыі кампанія плануе рэалізоўваць у краіны Мытнага саюза, у асноўным у Расію.

Новая вытворчасць, дзякуючы якой у Оршы былі створаны 43 рабочыя месцы, разгарнулася на трох тысячах квадратных метраў.

— Гэты сумесны беларуска-чэшскі праект вельмі важны як для рэгіёна, вобласці, так і для краіны ў цэлым, — падкрэсліў **намеснік міністра прамысловасці Беларусі Сяргей ГУНЬКО.** — На заводзе будзе выпускацца інавацыйная прадукцыя, аналагаў якой у Беларусі няма. Ее спажыўцы — тыя прадпрыемствы, якія сёння выпрабляюць трактары, аўтобусы і іншую тэхніку. Прыемна адзначыць, што вытворчасць стальных бясшвовых балонаў арганізавана менавіта ў аршанскім рэгіёне, які павінен стаць перадавым.

ТАА «Цыліндэрс-Бел» — не першы праект з прыцягненнем замежных інвестыцый, які ААТ «БМЗ» — кіруючая кампанія холдынга БМК — рэалізуе ў Оршы. Так, у 2014 годзе тут пачало працаваць адзінае ў Беларусі прадпрыемства па выпуску рукавоў высокага ціску СТАА «Мануп Гідраўлікс Мануфактурынг Бел», створанае сумесна з італьянскай кампаніяй Manuli Rubber Industries s.p.a.

КРОКІ ДА ЭКАЛОГІІ

# «OK compost»

## У Беларусі вырабляюць упакоўку з... кукурузы

**Усё больш людзей адмаўляецца ад пластыкавай тары. Цяпер стала модна складваць пакупкі ў палатняныя, вязаныя авоські, або, як іх па-сучаснаму называюць, шоперы. Імі карыстаюцца не толькі людзі старэйшага пакалення, але і моладзь. Пытанні адыходу ад пластыкавай упакоўкі разглядаюцца ў Беларусі на дзяржаўным узроўні. Задумваюцца пра экалагічную прадукцыю і вытворцы.**

У Лагойску група кампаній Kinglet пачала выпуск біяраскладальных пакетаў з матэрыялаў на аснове кукурузнага крухмалу, які атрымліваюць з лістоў гэтай сельскагаспадарчай культуры. Выкарыстаныя пакеты складуюцца разам з харчовымі і іншымі бытавымі адходамі на асобнай пляцоўцы і засыпаюцца зямлёй, унутры пад уздзеяннем сонца, вільгаці ўтвараюцца мікробы, якія пачынаюць «есці» ўпакоўку. Яна цалкам распадаецца на біямасу і ваду на працягу года і ператвараецца ў кампост, якім можна «падкормліваць» поле.

— У Беларусі пакуль няма аналагічных вытворчасцяў, дзе займаюцца такой прадукцыяй. Таму што яна не была запатрабавана на рынку, ды і падобныя матэрыялы ў нашай краіне не выпрабляюцца, — кажа **дырэктар прадпрыемства Максім МЯЛЕШКА.** — Іх мы закупляем у італьянскай кампаніі, якая з'яўляецца лідарам у сферы вытворчасці арганічнай сыравіны.

Тэрмін захоўвання кукурузных гранул абмежаваны, вытворца рэкамендуе выкарыстаць іх на працягу сямі месяцаў. Таму яны бяруцца пад канкрэтныя заказы спажыўцоў. Гатовая прадукцыя рэалізуецца ў буйных гандлёвых сетках. Кошт біяпакета вышэйшы, чым звычайнага поліэтыленавага, амаль удвая — 30—40 капеек. Яго можна адрозніць на вока — больш мяккі, шаўкавісты. А таксама — па спецыяльным лагатыпе «OK compost».

— Выкарыстанне пакетаў максімальна будзе запатрабавана ў тым выпадку, калі прымуць праграму па правільным зборы адходаў, будуць створаны ўмовы для прамысловага кампаставання біяпакетаў і атрымання з іх арганічных угнаенняў. А мы можам закрыць патрэбу беларусаў у экалагічнай упакоўцы, — сказаў напрыканцы Максім Мялешка.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ПАТРЭБНЫ ПАДАРУНАК

**Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Віцебскага раёна атрымаў спецыялізаваны аўтамабіль для перавозкі людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Ён быў перададзены ўчора падчас урачыстай цырымоніі.**

Сродкі, а гэта 26 тысяч долараў, выдзеліў урад Японіі ў межах праграмы «Карані травы — грантавая дапамога для праектаў па забеспячэнні бяспекі чалавека». Удзел ва ўрачыстай цырымоніі ўзяў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Японіі ў Рэспубліцы Беларусь Хірокі Такунага. Ключы ад аўтамабіля ён перадаў дырэктару Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Віцебскага раёна Леаніду Кавалёву. Патрэбу ў дадатковым транспарце сацыяльная ўстанова мае даўно. У Віцебскім раёне 358 населеных пунктаў, у якіх пражывае больш за 37 тысяч чалавек.

Пераважная большасць праектаў праграмы «Карані травы» дагэтуль рэалізоўвалася ў медыцынскай сферы. Гранты атрымлівалі медыцынскія ўстановы на набыццё абсталявання. Гэта ж першы праект у сацыяльнай сферы і другі ў Віцебскай вобласці. Праграму «Карані травы» ў Беларусі ўрад Японіі рэалізуе з 2004 года. За гэты час медыцынскім установам, якія перамагалі ў адпаведным конкурсе пасольства Японіі, закупілі дыягнастычнае і іншае абсталяванне на суму больш за 4 мільёны долараў.

**Алена КРАВЕЦ.**


## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ООО «Белхартэх», 220125, г. Минск, ул. Уручская, д. 23а, комн. 310 |

**Предмет аукциона**

| № лот | Наименование |
|---|---|
| 1 | **Установка плазменной резки** с БМТ 1560ПР + источник Powermax 105А, укомплектована отдельным вентиляционным столом, в том числе: установки плазменной резки с ЧПУ БМТ 1560ПР (вентилируемый стол, короб вентилируемый секционный вытяжной), аппарат плазменной резки Hypertherm PowerMax 105; компрессор Remeza СБ4/С2ОО.Л 500), год выпуска 2013, завод. № 20130024., расположенная по адресу: г. Минск, Бетонный проезд, 6. |
| | **Начальная цена без НДС – 13 981,50 бел. руб. (шаг аукциона – 699,08 бел. руб.)** |
| 2 | **Сварочный полуавтомат** Lincoln Electric Speedtec 505 SP, год выпуска 2015, завод. № P110605798, расположенный по адресу: г. Минск, ул. Захарова, 51 (склад) |
| | **Начальная цена без НДС – 1 316,50 бел. руб. (шаг аукциона – 65,83 бел. руб.)** |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 18.00, контактный телефон +375 (29) 628-17-94 (Мисникова Татьяна Эдвардовна)

Лица, желающие принять участие в аукционе, обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов аукциона определяется ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»**

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения аукциона, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 4 (четырех) процентов от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано газете «Звязда» от 01.10.2019

**Дата, время и место проведения аукциона: 02.12.2019** в 12.00, г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Дата, время, место окончания приема заявлений на участие в аукционе: 29.11.2019** до 17.00, г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**



## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении аукциона

**ЛОТ 4:** право заключения договора аренды сроком на 5 лет части помещения площадью 82,2 кв. м по адресу: г. Гродно, ул. Буденного, 37.
**Размер ежемесячной арендной платы:** 49,32 базовой арендной величины.
**Условия проведения аукциона:** целевое назначение арендуемых площадей – склад, офис, оказание услуг, розничная торговля.
**Начальная цена продажи объекта –** 347,30 руб. (триста сорок семь рублей тридцать копеек) с учетом НДС.
**Сумма задатка –** 35 руб. (тридцать пять рублей)

**Продавец –** УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги», объединенная станция Гродно, 230023, г. Гродно, ул. Буденного, 37, тел. 8-0152-73-43-52, факс 8-0152-72-24-58

**Организатор торгов –** Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 55-87-70, 55-87-71

**Условия расчетов и заключения договора аренды:**
– срок подписания договора аренды – 10 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона с представлением копии платежных документов перечисления суммы за право заключения договора аренды,
– срок оплаты – 7 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона (но до заключения договора аренды)

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 17 декабря 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**
**Последний день приема заявлений – 13 декабря 2019 г. до 15.00**

*Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/*



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 14 лістапада 2019 года.**